НОВЫЯ ПАДРАБЯЗНАСЦІ СПРАВЫ АБ ГЕНАЦЫДЗЕ

ВЯДОМЫЯ БЕЛАРУСЫ – АБ ТЫМ, ЯК СУСТРАКАЛІ ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 мая 2024 г.
СЕРАДА
№ 90 (30224)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

С ДНЁМ ПЕРАМОГІ

Нашы маральныя арыенціры

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Перамогі!

Гэтае свяшчэннае свята адгукаецца ў нашых сэрцах вялікай радасцю і бязмернай удзячнасцю савецкаму народу, які знішчыў фашызм і выратаваў будучыню чалавецтва цаной мільёнаў жыццяў.

У кожным кутку, кожнай сям'і Беларусі спароджаная нянавісцю і ідэямі сусветнага панавання вайна пакінула незагойныя раны ад жахлівых злачынстваў гітлераўскіх катаў і іх паслугачоў.

Гераічная барацьба з ворагам і самаадданая праца ў тыле сталі ўвасабленнем усенароднага супраціўлення і гатоўнасці беларусаў да самаахвяравання.

Адзінства нашых продкаў, іх любоў да Радзімы і шчырая вера ў перамогу назаўжды сталі маральнымі арыенцірамі для ўдзячных пакаленняў мірнай і незалежнай беларускай дзяржавы.

Праз гады праўда пра Вялікую Перамогу засцерагае нашу зямлю ад пагроз новага часу, а ўсё чалавецтва — ад адраджэння разбуральных ідэй нацызму.

Беларускі народ свята шануе памяць загінулых і ніколі не аддасць забыццю імёны бязвінных мучанікаў і славу мужных абаронцаў і вызваліцеляў.

Жадаю нашым дарагім ветэранам моцнага здароўя і даўгалецця, а таксама шчасця, міру і дабра ў кожны дом.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Ветэранаў, для якіх Вялікая Айчынная вайна — частка жыцця, а Дзень Перамогі — самы важны ў жыцці дзень, застаецца сярод нас усё менш. Тым каштоўнейшыя іх сведчанні, тым важней паглядзець ім у вочы.

Фёдару Сяргеевічу ФЕШЧАНКУ сёлета будзе 99 гадоў. Калі пачалася вайна, ён перайшоў у дзявяты клас. Але восенню 1941-га парту замяніў такарны станок — юнак пайшоў працаваць на абаронны завод на Урале. Давялося напоўніцу пакаштаваць і ваеннага хлеба. Пасля прызыву ў 1943-м асвоіў навуку артылерыста і ў складзе 3-га Беларускага фронту ўдзельнічаў у аперацыі «Баграціён». Лёс на ўсё жыццё звязаў яго з зямлёй, якую вызваляў. Тут атрымаў вышэйшую адукацыю, абараніў кандыдацкую дысертацыю, доўгі час працаваў у Інстытуце эканомікі НАН і ў БДУ...

Да сёння Фёдар Сяргеевіч захоўвае сваю кніжку чырвонаармейца — франтавы дакумент, атрыманы 80 гадоў таму. Антону Сцяпанавічу ЗУБОЎСКАМУ, калі пачалася вайна, было пятнаццаць. Вайна застала яго ў Пухавіцкім раёне, у роднай вёсцы, дзе ён выжываў з сям'ёй пад акупацыяй. 14 ліпеня 1944-га быў прызваны ў Чырвоную Армію, перамогу сустракаў у Сілезіі камандзірам аддзялення стралковага ўзвода. Пасля вайны скончыў ваеннае авіяцыйнае інжынернае вучылішча ў Кіеве, пасля заканчэння ваеннай службы ў 1977 годзе вярнуўся на Радзіму. Мае званне палкоўніка. Простыя словы біяграфіі. Простыя немаладыя твары на фота. Менавіта дзякуючы вось такім простым людзям у нас ёсць вялікае свята — Дзень Перамогі. У нас ёсць жыццё і будучыня.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ПРАЎДА АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ ФАШЫЗМУ СЛУЖЫЦЬ СУР'ЁЗНАЙ ПЕРАСЦЯРОГАЙ ЧАЛАВЕЦТВУ»

Для беларусаў памяць аб вайне мацнейшая за час і не мае межаў

Фота БелТА.

За апошнія 80 гадоў беларусы пераканаліся, што мір — самая вялікая каштоўнасць. У Дзень Перамогі важна не толькі ўспамінаць аб вайне, але і гаварыць аб міры. Успамінаць, якой цаной ён дастаўся нашым продкам, і аналізаваць, што трэба рабіць сучаснаму пакаленню, каб захаваць спакой. Менавіта такія пасылы сталі лейтматывам урачыстага сходу з нагоды Дня Перамогі, які прайшоў у Палацы Рэспублікі. Удзел ва ўрачыстым сходзе прыняў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў нашай гісторыі нямала яркіх старонак, якімі мы па праве ганарымся. Не ўсе з іх захавалі сваю значнасць да нашых дзён. Многія, страціўшы былыя сэнсы, аказаліся папросту забытыя. «Аднак ёсць даты і падзеі, якія нясуць у сабе разуменне сутнасці і праўду жыцця. Яны непадуладныя часу і абставінам, перадаюцца праз пакаленні з малаком маці, засцерагаюць ад памылак і дапамагаюць ствараць будучыню. Для беларусаў такой падзеяй стала Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне», — сказаў ён. Менавіта таму, па словах Прэзідэнта, у абноўленай Канстытуцыі замацаваны тэзіс аб тым, што «дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

УСЕ НАРОДЫ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ЯКУЮ ЦАНУ ЗАПЛАЦІЛІ БЕЛАРУСЫ ЗА МІР І СВАБОДУ

«Для нас, беларусаў, праўда і памяць аб вайне мацнейшыя за час і не маюць межаў. Мы памятаем нашых сяброў-антыфашыстаў, герояў палка «Нармандыя –Нёман», удзельнікаў сустрэчы на Эльбе і іншыя прыклады сумеснай барацьбы з ворагам. Гэта прадмет нашага агульнага гонару з усімі, хто разам з намі супрацьстаяў фашызму. І хто яшчэ ганарыцца, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Усе народы зямлі павінны ведаць, якая неймаверна высокая цана была заплачана беларусамі за мір і свабоду». Беларускі лідар прывёў лічбы, над якімі заклікаў задумацца. Звыш 300 тысяч нашых суайчыннікаў былі сагнаны ў Германію ў якасці рабоў. Фактычна ўсё насельніцтва такой краіны, як Ісландыя, ці ўвесь даваенны Мінск. Толькі сумна вядомы лагер Трасцянец забраў жыцці больш за 200 тысяч мірных грамадзян.

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

КОРАТКА

- **Дзяржмузеі 9 Мая можна будзе наведаць бясплатна.**
- Мемарыяльную пліту з імёнамі 60 воінаў РСЧА ўстанавілі на брацкай магіле ў Аршанскім раёне.
- **Беларуская цэментная кампанія запусціла ўласны цягнік для дастаўкі цэменту ў Расію.**
- Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 мая склалі $8,442 млрд.
- **Фізасобы ў Беларусі ў красавіку прадалі на $82,8 млн валюты больш, чым купілі.**
- У Беларусі за год плануюць пабудаваць 15 дзіцячых садкоў.

«ПРАЎДА АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ ФАШЫЗМУ СЛУЖЫЦЬ СУР'ЁЗНАЙ ПЕРАСЦЯРОГАЙ ЧАЛАВЕЦТВУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усё, што было створана беларусамі, наша нацыянальнае багацце было знішчана або вывезена на Захад. «Сотні гета і канцлагераў ператварылі нашу мірную зямлю ў канвеер смерці. Сюды ж звозілі паміраць людзей з краін Еўропы.

Па сутнасці, гэта быў генацыд мірнага насельніцтва. Гэты факт афіцыйна ўстаноўлены Надзвычайнай урадавай камісіяй адразу пасля вайны, і ў наш час расследаванне працягвае Генеральная пракуратура, — прывёў яшчэ адзін прыклад Прэзідэнт. — Як бы хто ў «вялікіх дэмакратыях» не пярэчыў і не перашкаджаў, што б ні казаў, нягледзячы на асобы і тэрміны даўнасці, мы будзем выяўляць і аддаваць пад суд датычных да злачынстваў нацыстаў. Няхай нават пасмяротна ці завочна».

Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, сёння ў многіх заходніх дзяржавах наша Перамога аб'яўлена па-за законам. Пад сцягамі дывізій СС маршыруюць фашыствуючыя радыкалы. На дзяржаўным узроўні ўшаноўваюць ваенных злачынцаў. А тыя, хто шануе памяць аб Вялікай Перамозе, аб'яўляюцца ворагамі нацыі. «Беспрэцэдэнтныя інфармацыйныя атакі і разнастайныя фальсіфікацыі з боку калектыўнага Захаду апраўдваюць здзейсненыя нацыстамі і іх памагатымі зверствы. Мы бачым, як рэваншысты спрабуюць выцягнуць з апраметнай збанкрутавалую нацысцкую ідэалогію. Усё падаецца так, нібы і не было ніколі Нюрнбергскага трыбунала. І гаворка не толькі пра Украіну, — адзначыў ён. — У гэтых умовах праўда аб злачынствах фашызму служыць сур'ёзнай перасцярогай чалавецтву, а захаванне гістарычнай памяці набывае асаблівае значэнне».

З РАСПАДАМ СССР УРОКІ ВАЙНЫ БЫЛІ ЗАБЫТЫЯ

Па словах беларускага лідара, народам Еўропы даўно час зразумець, што Вялікая Перамога — наш агульны здабытак. Дзякуючы ёй, а таксама палітычнай, эканамічнай, ваеннай моцы Савецкага Саюза Еўразійскаму кантыненту на доўгія дзесяцігоддзі быў забяспечаны мір. «Нягледзячы на ідэалагічныя супярэчнасці і геапалітычную барацьбу ў пасляваенны час, сусветным гульцам усё ж удавалася дамаўляцца», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў гістарычны факт: ва ўмовах «халоднай вайны» супрацьлеглымі бакамі рабіліся рэальныя крокі да разрадкі на аснове балансу сіл. Міжнародныя арганізацыі выступалі рэальнымі пляцоўкамі для перагавораў і садзейнічалі захаванню міру і ўмацаванню бяспекі на планеце. «Але з распадам СССР урокі вайны былі забытыя. Палітыкі некаторых краін увялі сябе гаспадарамі свету. Стала звычайнай практыкай груба і бесцырымонна ўмешвацца ў справы суверэнных краін. Дастаткова толькі абвясціць непажаданую краіну зонай сваіх інтарэсаў альбо «пагрозай» нацыянальнай бяспекі, як тут жа ідуць дывановыя бамбардзіроўкі і звяржэнне «недэмакратычнага» рэжыму. Па гэтай прычыне ў розных кутках планеты пастаянна ўспыхваюць ачагі напружанасці, якія разбураюць краіны і цэлыя рэгіёны. Прыкладаў вялізнае мноства», — адзначыў Прэзідэнт. Па словах кіраўніка дзяржавы, свет прыйшоў да таго, што сёння ні адна дзяржава не адчувае сябе абароненай ад знешняй агрэсіі. Гэтаму, па яго словах, садзейнічае разбурэнне краінамі калектыўнага Захаду фундаментальных асноў — стратэгічнай стабільнасці і міжнародных інстытутаў бяспекі. «Іх кіраўнікі спрабуюць адцягнуць насельніцтва сваіх дзяржаў ад назапашаных унутраных праблем. Татальная русафобія стала папулярным палітычным трэндам у кіруючых еўрапейскіх эліт і іх заакіянскіх гаспадароў. Яны спешна ствараюць страшны вобраз знешняга ўсходняга ворага, які нібыта гатовы танкамі пайсці на Берлін. Пад шырмай міфаў аб дэмакратыі, правах чалавека заходнія лідары навязваюць дзяржавам культуру адмены, праводзяць фільтраванне народаў праз ціск і шантаж, мяцяжы і проксі-войны, гадуюць пакаленне, для якога нянавісць становіцца жыццёвым крэда», — расказаў беларускі лідар. Ён заўважыў, што сёння абвастрае абстаноўку пашырэнне ваенных блокаў і саюзаў ва ўрон бяспецы іншых краін, а таксама беспрэцэдэнтнае нарошчванне патэнцыялу паўночнаатлантычнага блока ў нашым рэгіёне. «Усё гэта ўжо каля заходніх і паўднёвых межаў Беларусі. Ад асобных дзеячаў мы чуем размовы аб вайне і ядзерных ударах», — заўважыў ён.

ПРАВЕРКА НОСІЦЬ ВЫКЛЮЧНА АБАРОНЧЫ ХАРАКТАР

Урачысты сход стаў пляцоўкай не толькі для таго, каб успомніць Вялікую Айчынную вайну, але і даў магчымасць абмеркаваць, што робіцца для таго, каб не дапусціць паўтарэння тых жудасных падзей. Прэзідэнт раскрыў падрабязнасці раптоўнай праверкі сродкаў — носьбітаў нестратэгічнай ядзернай зброі, якая пачалася 7 мая па распараджэнні Галоўнакамандуючага.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на фоне пастаянна ўзрастаючай ваеннай актыўнасці ў Еўропе ў Беларусі прымаецца комплекс мер па адэкватным рэагаванні на абвастрэнне абстаноўкі. Пра гэта апошнім часам сказана нямала. «Дадзеная дзейнасць па абароне бяспекі нашай краіны носіць плануемы характар і прадугледжвае некалькі этапаў. У рамках першага этапу, у адказ на канцэнтрацыю войскаў каля паўночна-заходніх граніц Беларусі (а гэта ўжо пад 90 тысяч чалавек, ваенныя людзі добра ведаюць, што такое канцэнтрацыя такіх войскаў, такога не было ніколі), выводзіліся ўзмоцненыя механізаваныя і танкавыя батальёны для прыкрыцця дзяржаўных граніц. Вы гэта бачылі на Ашмянскім і Пастаўскім напрамках. Як я казаў, мы ўжо лоб у лоб сталі з паўночнаатлантычным блокам», — адзначыў Прэзідэнт. На гэта словах, адпрацаваны пытанні недапушчэння пранікнення на нашу тэрыторыю дыверсійна-разведвальных груп, незаконных узброеных фарміраванняў і барацьбы з імі на пагранічных тэрыторыях. На гэтым фоне таксама праведзена раптоўная праверка мабілізавання і прывядзення ў поўную баявую гатоўнасць адпаведных механізаваных зенітна-ракетных брыгад. Праведзена маштабная праверка сіл паветранай і супрацьпаветранай абароны. «Гэтыя праверкі паказалі эфектыўнасць існуючай сістэмы баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці, здольнасць брыгад своечасова перайсці ў вышэйшую ступень баявой гатоўнасці і выканаць задачы па прызначэнні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Прэзідэнта, пачынаецца распрацоўка мер другога этапу мер рэагавання. «Для яго правядзення генеральнымі штабамі Узброеных Сіл Беларусі і Расіі прадугледжана праверка сіл і сродкаў сумеснай рэгіянальнай групоўкі войскаў, у рамках якой упершыню плануецца адпрацаваць пытанні прымянення нестратэгічнай ядзернай зброі. Падчас праверкі будзе ажыццяўляцца падача спецбоепрыпасаў у ракетныя і авіяцыйныя войскія часці, загрузка іх на пускавыя ўстаноўкі, падвеска на самалёт. Ракетныя дывізіёны аператыўна-тактычных комплексаў «Іскандэр» і «Паланэз» будуць скрытна выведзены ў назначаныя пазіцыі і будуць адпрацоўваць пытанні нанясення ракетных удараў для адбіцця верагоднага нападу на Беларусь. Адначасова авіяцыйныя войскія часці падрыхтуюць франтавыя штурмавікі Су-25 са спецбоепрыпасамі па падтрымцы войскаў, якія абараняюцца, і нанясення працівуніку непрымальнага ўрону», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, мерапрыемствы будуць праводзіцца на агульным аператыўна-стратэгічным фоне з адпрацоўкай у тым ліку расійскімі войскамі прымянення нестратэгічнай ядзернай зброі. Для атрымання аператыўнай інфармацыі беларускім ваенным дапамогуць воінскія часці Маскоўскага і Ленінградскага ваенных акругоў, таксама сродкі і сілы Балтыйскага флоту, размешчаныя ў Калінінградскай вобласці. Рашэнне аб сумеснай каардынацыі і прымяненні войскаў з выкарыстаннем спецбоепрыпасаў прэзідэнты Беларусі і Расіі маюць намер абмеркаваць на сустрэчы ў Маскве 8 мая. Тады ж лідары прымуць канчатковае рашэнне.

«Непасрэднае кіраванне, кіраўніцтва войскамі, падача сігналаў на вучэбнае прымяненне нестратэгічнай ядзернай зброі будзе ажыццяўляцца генеральнымі штабамі Беларусі і Расіі ў адпаведнасці з існуючымі планамі ўзаемадзеяння», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што праверка носіць выключна абарончы характар: «Яна заклікана забяспечыць гатоўнасць беларускіх воінскіх часцей да работы са спецыяльнымі боепрыпасамі, а таксама наладзіць механізмы кіравання войскамі і ўзаемадзеяння саюзных органаў кіравання. Пасля завяршэння сумеснай трэніроўкі нашы войскі прадоўжаць мерапрыемствы па адэкватным рэагаванні на змяненне абстаноўкі».

ЛЮБАЯ АГРЭСІЯ — І АДКАЗ БУДЗЕ ІМГНЕННЫ

«Паважаныя сябры, я вам адкрыта аб гэтым кажу, магчыма, і не варта было б. Але я хачу, каб вы ведалі: мы ніколі так блізка не падыходзілі да парога ядзернай вайны», — прызнаўся Прэзідэнт. Ён заўважыў, што заявы заходніх палітыкаў (у авангардзе Францыя) вядуць да эскалацыі напружанасці не толькі на еўрапейскім кантыненце, але і ў свеце ў цэлым.

«Я чалавек мірны, я не хачу вайны. Я гісторык і добра ведаю, што Беларусь заўсёды вяла не толькі і не столькі свае войны. Беларусь заўсёды была тэатрам ваенных дзеянняў. Я не толькі па кніжках вывучаў Другую сусветную і Вялікую Айчынную вайну. Сталіны Прэзідэнтам, я азнаёміўся з сапраўдным становішчам спраў у чэрвені 1941 года і напярэдадні на нашай граніцы, калі мы верылі ў тое, што нам гаварылі. Нас пераконвалі, што вайны не будзе, што ўсё нармальна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, Беларусь не збіраецца паддавацца ні на якія правакацыі і тым больш не збіраецца ні з кім ваяваць. «Кідаць краіну, мільёны людзей у гарніла вайны — гэта не да мяне. Проста наша задача — калі зноў, як гэта было, варожы бот ступіць на нашу зямлю, мы павінны нанесці ворагу непрымальны ўрон. І ён гэта павінен разумець, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы не верым ніякім абяцанням. Мы яшчэ раз заяўляем: «Мы ні на кога не збіраемся нападаць». Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь не ўмешваецца ў чужыя, далёкія канфлікты. Беларусы глядзяць за сваёй зямлёй і рэагуюць на тое, што адбываецца побач.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: сёння нельга быць упэўненым, што замежныя войскі, скандэнтраваныя каля нашых граніц, не атакуюць Беларусь. Таму Галоўнакамандуючым было прынята рашэнне на ўсіх напрамках (а яны вядомыя) выставіць батальённыя тактычныя групы, і нашы ваенныя нясуць службу па абароне бяспекі нашай дзяржавы. Будзе ціха — выдатна. «Калі нехта прыменіць супраць нас зброю, мы адкажам. Прычым імгненна. Мы не будзем маляваць ніякіх ліній», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што падчас апошняй вайны Беларусь была захоплена за месяц, сёння гэта магчыма яшчэ хутчэй. «Таму ніякіх ліній. Ніякіх. Любая агрэсія — і адказ будзе імгненны», — папярэдзіў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што сёння ідзе шмат размоў аб тым, прыменіць Беларусь ядзерную зброю ці не. Ён адказаў тым, хто вядзе такія размовы: «Паслухайце. Гэта зброя стрымлівання, гэта зброя абароны. Ніхто ў наступленне з гэтай зброяй не пойдзе. Рабіце высновы».

ТРЭБА СПЫНІЦЬ ЗВАР'ЯЦЕЛЫХ ПАЛІТЫКАНАЎ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: самае страшнае, што ў разуменні Захаду трэцяя сусветная вайна не з'яўляецца чымсьці адцягненым, а падаецца як звычайная і цалкам дапушчальная. «Але наўрад ці гэта трэба простым людзям у Еўропе і іншых рэгіёнах планеты, — падкрэсліў ён. — Сёння я хацеў бы чарговы раз ад імя міралюбівага беларускага народа звярнуцца да народаў блізкага і далёкага замежжа, сітуацыя падштурхоўвае да гэтага. Трэба спыніць звар'яцелых палітыканаў, не даць ім шанцу ператварыць усё жывое на планеце ў попел», — заявіў беларускі лідар. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на ўсе спробы запалохвання Беларусь адказвае паслядоўнай міратворчай пазіцыяй і палітыкай стратэгічнага стрымлівання. «Мы ўлічылі памылкі пачатку Вялікай Айчыннай вайны і больш не павядзёмся на абяцанні, правакацыі і загаворванне прамой ваеннай пагрозы. Як і савецкія салдаты ў далёкім 45-м, мы разам з нашым саюзнікам стаім на абароне не толькі тэрытарыяльных межаў, але і межаў нашай агульнай гістарычнай памяці», — канстатаваў Прэзідэнт.

Літаральна некалькіх тыдняў таму на Усебеларускім народным сходзе былі прыняты два асноўныя дакументы — Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што тыя, хто хоча разабрацца ў нашых планах і нашай пазіцыі, могуць звярнуцца да гэтых дакументаў. Яны апублікаваны ў адкрытым доступе. Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына вызначаюць канкрэтныя меры стратэгічнага парадку, якія дапамогуць забяспечыць надзейную абарону канстытуцыйнага ладу нашай дзяржавы, суверэнітэту і мірнага жыцця народа.

«Паўтараю каторы раз: мы мірная краіна і не разглядаем ні адну дзяржаву ў якасці праціўніка. Але калі спатрэбіцца, беларускі народ устане на абарону роднай зямлі, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе магчымыя сілы і сродкі», — канстатаваў Прэзідэнт. Галоўным гарантам ваеннай бяспекі краіны, па яго словах, з'яўляюцца нашы Узброеныя Сілы. «Таму мы іх падтрымліваем у пастаяннай баявой гатоўнасці і забяспечваем самай сучаснай зброяй. Дзякуючы прафесійнай вывучцы, патрыятызму, вернасці воінскаму абавязку і Айчыне воіны беларускай арміі здольны гарантаваць бяспеку дзяржавы і нанесці праціўніку непапраўны непрымальны ўрон, — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Аднак сёння важная не толькі ваенная сіла. Ніякае самае сучаснае ўзбраенне не зможа зламаць народ, калі будзе адзінства. Нашы праціўнікі гэта добра разумеюць і робяць усё, каб нас раз'яднаць».

МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ МОЦНЫМІ, АРГАНІЗАВАНЫМІ, МАНАЛІТНЫМІ

Важнай часткай урачыстага сходу стала ўзнагароджванне вымпеламі «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» беларускія населеныя пункты, якія найбольш самаддана правялі сябе ў барацьбе з ворагам. Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, усе вартыя гэтай узнагароды. І прызнаўся, што адабраць асобных было вельмі складана. «У кожным населеным пункце, на кожным кавалку беларускай зямлі фашысты сутыкаліся з жорсткім супраціўленнем. Усюды зямля проста палала пад ботам акупантаў. І вы ведаеце з расповедаў вашых бацькоў і дзядоў, як няпроста было выжыць тым, хто выжыў у зямлянках, акопах і лясах. Паўгалодныя, вашывыя, напаўголыя, асабліва з дзецьмі. Гэтага нельга больш дапусціць. Гэтага паўтарэння ў гісторыі Беларусі не будзе, — звярнуўся да трагічных урокаў гісторыі Прэзідэнт. — Гаворачы ўсё гэта, я думаю аб тым, каб не перабраць, не напружыць наша грамадства. Усё, што мы робім, мы робім для таго, каб гэтага не здарылася. Я не веру, што ў Заходняй Еўропе — затлусцелай, хтосьці захоча лезці ў бруднуя, вашывыя акопы, каб ваяваць. Яны ад гэтага адвыклі. Ды і наша моладзь гэтага не хоча. Гэта мы, якія нарадзіліся тады, недалёка ад той Вялікай Перамогі, разумеем, чаго каштавала нашым бацькам і дзядам усё гэта».

Аднак, па словах кіраўніка дзяржавы, сёння трэба быць гатовымі да ўсяго. «Я не веру, што яны звар'яцелі і пераступяць рысу, якую нават намалявалі самі», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што не верыць у тое, што прэзідэнт Францыі, ядзернай дзяржавы, Эмануэль Макрон, цалкам разумны, недурны чалавек, але які заяўляе аб гатоўнасці хоць заўтра ўвесці ўзброеныя сілы ва Украіну і пачаць вайну, ці, напрыклад, польскія ўлады, ці яшчэ хто — што яны на самай справе зробяць тое, пра што кажуць. «Каб яны гэтага не зрабілі, мы павінны быць моцнымі (пра гэта ўжо гаварылася, цяпер паважаюць толькі сілу). І якімі б мы ні былі — маленькімі або вялікімі, — мы павінны быць моцнымі, арганізаванымі, маналіты нымі», — заявіў беларускі лідар.

З ДНЁМ ПЕРАМОГІ

«НАША КРАІНА ДАСЯГНУЛА ТАКОГА ЎЗРОЎНЮ, КАЛІ НАШЫ ЛЮДЗІ ПАКАРАЮЦЬ КОСМАС»

Марыну ВАСІЛЕЎСКУЮ сустракалі ў Савеце Рэспублікі

У сустрэчы таксама ўдзельнічалі члены Прэзідыума і Савета старэйшын верхняй палаты парламента. Першы касманаўт суверэннай Беларусі падзялілася дэталямі падрыхтоўкі і ажыццяўлення касмічнага палёту. Старшыня Савета Рэспублікі, у сваю чаргу, расказала, як беларусы сачылі за гэтай найважнейшай для краіны падзеяй, праінфармавала аб асаблівасцях работы сенатараў: заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці, рабоце з насельніцтвам.

«Вядома, як сказаў правільна Аляксандр Рыгоравіч, мы сталі касмічнай дзяржавай, гэта вельмі важна, — адзначыла спікер верхняй палаты парламента. — Казаць аб тым, што мы не займаліся космасам, будзе няправільна. Мы працавалі шмат. Нашы землякі-беларусы — касманаўты, і мы гэтым ганарымся. Але ў гісторыі суверэннай і незалежнай Беларусі вы — першая касманаўтка, якая пакарыла космас. Нам, жанчынам, удвая прыемна, што гэта жанчына. Жанчына, якая пабывала ў космасе».

Па словах Наталлі Качанавай, многія назіралі за тым, як стартаваў касмічны карабель, перажывалі, як праходзіў увесь касмічны палёт. «Вядома, перажывалі і тады, калі было прызямленне, бо ўсе зноў паглыбіліся ў космас, чыталі, якія этапы самыя складаныя, — расказала спікер. — Вы з такой чароўнай усмешкай, калі было прызямленне... Гэта было такое захапленне. Я падумала: вось, што для нас важна. Важна, што сёння наша краіна дасягнула такога ўзроўню ў сваім развіцці, калі нашы людзі пакараюць космас, што такія прыгожыя дзяўчаты пабывалі ў космасе, правялі там пэўную работу, якая была запланавана».

Марына Васілеўская падкрэсліла, што для яе высокі гонар знаходзіцца ў Савеце Рэспублікі. Герой Беларусі падзялілася сваімі ўражаннямі ад касмічнага палёту, планамі на будучыню.

«Падрыхтоўка была нялёгкая, яна праходзіла дзесьці восем месяцаў, — расказала касманаўт. — Было нялёгка ўпісацца, бо гэта не маё асяроддзе, я нічога гэтага не вывучала. Касмічная тэма — для мяне новая, але вельмі цікавая».

Марына Васілеўская падзялілася, што з дзяцінства марыла быць настаўнікам, аб космасе ніколі не думала. «Калі ўжо пайшла працаваць у авіякампанію «Белавія», знайшла сябе ў гэтай прафесіі, — падзялілася першая касманаўтка суверэннай Беларусі. — Вядома, было страшна. Але дзякуючы сваёй рабоце я зразумела, што трэба выходзіць з зоны камфорту, пераадоленне пэўных перашкод узвышае нас. Трэба імкнуцца да большага, і тады сапраўды ўсё атрымаецца».

Касманаўтка расказала, як праходзіў адбор (разглядалася тры тысячы заявак). Па яе словах, гэта было своечасова, бо пэўных прафесійных вышынь Марына Васілеўская ўжо дасягнула і хацела развівацца далей, вышэй. «Вышэй аказаўся толькі космас, і гэта, вядома, нешта неверагоднае, — падкрэсліла яна. — З радасцю прыняла гэтую прапанову і прайшла ўсе этапы падрыхтоўкі, праверкі, медыцынскае абследаванне было вельмі сур'ёзнае. Удзячна бацькам за такія гены, за маё здароўе. Вяду здаровы лад жыцця».

Марына Васілеўская расказала, што падчас падрыхтоўкі да касмічнага палёту ёй пашанцавала працаваць з выдатнай камандай, таму спраўляцца з пастаўленымі задачамі было нескладана. Чаго не скажаш пра пасадку. «Пасадка была жорсткая», — падзялілася касманаўтка. Аднак у космасе, нягледзячы на перасцярогі калег, яна адчувала сябе добра.

У завяршэнні сустрэчы Наталля Качанава падарыла Марыне Васілеўскай ляльку-касманаўта ручной работы і ўручыла іншыя падарункі.

У размове з журналістамі Марына Васілеўская выказала ўдзячнасць Старшыні Савета Рэспублікі за запрашэнне пабываць у верхняй палаце парламента. «Было вельмі прыемна пагутарыць з Наталляй Іванаўнай, членамі Прэзідыума, абмеркавалі пытанні майго палёту, пацікавіліся маім самаадчуваннем — была вельмі добрая, душэўная размова, — падкрэсліла Герой Беларусі. — Рыхтуюся да грамадскай дзейнасці. Хачу наведаць шмат нашых дзяржаўных арганізацый, школы, садкі. Усе чакаюць. З вялікім задавальненнем хачу падзяліцца сваім досведам, настроем, задаць добры настрой хлопцам і дзяўчатам, пажадаць ім усяго добрага, каб яны дасягалі сваіх мэт і імкнуліся да найлепшага».

Касманаўтка падзялілася, што не стамілася адказваць на адны і тыя ж пытанні пра космас. «Усё, што я раблю, раблю ад душы, мне гэта падабаецца, — падзялілася яна. — Мне здаецца, ад гэтага немагчыма стаміцца. Цудоўна расказваць аб космасе, нашай зямлі, папулярызаваць космас. Хачу сказаць, каб усе любілі і цанілі нашу Радзіму, нашу Зямлю. Сапраўды толькі, напэўна, з космасу бачыш, якая яна маленькая, далікатная. У космасе я адчувала гонар за нашу краіну».

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

ЗАБУДЗЕМ САЛДАТ ВАЙНЫ — БУДУЧЫНІ Ў НАС НЕ БУДЗЕ

Усяго ў Беларусі вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» ўзнагароджаны 36 населеных пунктаў: 27 у адпаведнасці з указам ад 6 кастрычніка 2004 года (у 60-ю гадавіну вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), калі і была заснавана ўзнагарода, і дзевяць — па ўказе ад 2 лютага 2024 года, да 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сёлета ўзнагароды ўдастоены гарады Баранавічы, Дзяржынск, Дзятлава, Калінкавічы, Любань, Асіповічы, Чавусы, гарадскія пасёлкі Обаль і Асвея. Прэзідэнт уручыў адпаведныя ганаровыя граматы прадстаўнікам кіраўніцтва гэтых населеных пунктаў.

Прадстаўнікі гэтых населеных пунктаў зрабілі журналістам невялікі экскурс у мінулае свайго краю і расказалі, як увекавечваецца гераічная памяць. Міхаіл Слесарэнка, старшыня Асіповіцкага раённага савета ветэранаў, адзначыў, што ўручэнне вымпела — яшчэ адзін напамін і доказ таго, што трэба берагчы мір на зямлі і рабіць для гэтага ўсё. «Мы ўдзячны нашаму Прэзідэнту, які заўсёды стаяў гарой за мір і заўсёды ўсім нагадваў, што наш народ мірны. І мы пастараемся абараніць мір на нашай зямлі», — сказаў ён. Паводле слоў Міхаіла Слесарэнкі, у Асіповіцкім раёне засталося два ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Ім аказваецца ўся неабходная ўвага, павага і клопат. «Мы разумеем, што мы, старэйшае пакаленне, дзеці ветэранаў, павінны перадаць дзецям, будучым пакаленням гэтую памяць, навучыць іх гэтак жа яе берагчы і захоўваць. Цяпер уся надзея толькі на іх», — падкрэсліў Міхаіл Слесарэнка.

Анатоль Вінкевіч, старшыня Чавускай раённай ветэранскай арганізацыі, падкрэсліў, што Дзень Перамогі быў, ёсць і будзе найважнейшым святам. І гэта несумненна, асабліва цяпер. «Чавускі раён, які я прадстаўляю, падчас вайны пацярпеў вельмі моцна. На нашай тэрыторыі дзевяць месяцаў стаяў фронт. Да вайны ў Чавускім раёне жыло звыш 50 тысяч чалавек, пасля вайны засталося менш за 30», — распавёў ён. Зусім нядаўна ў Чавускім раёне адкрылі мемарыял загінулым на рацэ Проні. Акрамя дзяржаўнай падтрымкі, грошы на стварэнне мемарыяла збіралі і неабыякавыя людзі. «Памяць аб салдатах Вялікай Айчыннай вайны павінна жыць вечна і быць прыкладам для нашай моладзі. Калі мы іх забудзем — будучыні ў нас не будзе», — запэўніў Анатоль Вінкевіч.

Валерыя СЦЯЦКО.

ВЫЗВАЛЕННЮ БЕЛАРУСІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

У БДЭУ прайшла дыктоўка па матэрыялах «Звязды» пра аперацыю «Баграціён»

«Дзень нашай памяці і ўдзячнасці». Так называўся тэкст сёлетняй агульнаўніверсітэцкай дыктоўкі па беларускай мове, якая прайшла ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. За яе аснову ўзяты тэксты газеты «Звязда» пра аперацыю «Баграціён» — адну з найбуйнейшых вайсковых аперацый у сусветнай гісторыі. Агучыў тэкст Руслан ЧАРНЕЦКІ, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы.

Дыктоўка была падрыхтавана кафедрай беларускай і рускай моў факультэта міжнародных бізнес-камунікацый. **Загадчык кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Вольга ГУБСКАЯ** распавяла, што такая дыктоўка ўжо стала добрай традыцыяй Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

— Звычайна мы праводзім яе ў лютым — святкуем Міжнародны дзень роднай мовы. Але гэты год знакавы для нашай краіны. Менавіта сёлета адзначаецца 80-годдзе вызвалення Беларусі. А калі б не было Вялікай Перамогі, не было б і свята роднай мовы. Менавіта таму мы аб'ядналі дзве падзеі ў адну, і зразумела, што тэкст дыктоўкі прысвечаны падзеям вайны. А менавіта аперацыі «Баграціён», дзякуючы якой Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дарэчы, трэба адзначыць, што тэкст дыктоўкі складаўся па матэрыялах газеты «Звязда».

Чаму менавіта «Звязда» стала крыніцай тэксту? Вольга Губская прызналася, што наша газета — выданне, у якім заўсёды можна знайсці якасны матэрыял пра культурныя падзеі краіны, адсылкі да гістарычнага мінулага. За публікацыямі «Звязды» на кафедры сочаць, вось і знайшлі на старонках прыдатны матэрыял.

У зале, якая была цалкам запоўнена, прычым на дыктоўку прыйшлі як студэнты, так і выкладчыкі, стварылі адпаведную атмасферу з дапамогай музыкі. Прагучала цымбальная версія вядомай усім песні «Смуглянка», якая перанесла ў ваенныя гады. Удзельнікаў дыктоўкі прывіталі прарэктар па выхаваўчай рабоце Сяргей Скрыба і дэкан факультэта міжнародных бізнес-камунікацый Юлія Шаўрук.

Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага дэпутат Палаты прадстаўнікоў Руслан Чарнецкі ў сваім слове перад дыктоўкай прызнаўся, што з задавальненнем згадзіўся ўзяць удзел у гэтым мерапрыемстве, хаця прыйшлося адпрошвацца з рэпетыцыі. Тэму дыктоўкі артыст лічыць вельмі важнай. Руслан Чарнецкі зачытаў пра гэта вершаваныя радкі:

«Навекі слава тым, хто ў полі ратным
Загінулі за родныя палі,
За свой народ, за лёс народаў братніх,
За дзень наступны ўсяе зямлі».

Дэпутат прапанаваў ушанаваць хвілінай маўчання ўсіх, хто аддаў жыццё за Вялікую Перамогу, хто вызваляў нашу краіну.

Пасля хвіліны маўчання пачалася дыктоўка. Усе вельмі стараліся, часам задумваліся, а вось спісваць сэнсу не было: мэта не атрымаць добрую адзнаку, а праверыць свае веды ў роднай мове і прапусціць праз сябе карысную інфармацыю, закладзеную ў тэксце. А тэкст заканчваўся такім фрагментам: «Сімвалам народнага подзвігу савецкіх воінаў і партызан, загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, узвышаецца ў Мінску на плошчы Перамогі велічны помнік-абеліск. Гарыць і гарыць перад ім Вечны агонь — знак нашай памяці і ўдзячнасці героям, якія аддалі сваё жыццё дзеля мірнай будучыні. Праз дзесяцігоддзі, у сучаснай Беларусі, дзень 3 Ліпеня стаў галоўным дзяржаўным святам — Днём Незалежнасці».

Пасля заканчэння работы ўсе мелі магчымасць праверыць свае веды з дапамогай паўторнай чыткі і слайдаў на экране. А потым пачаўся дыялог з ганаровым госцем. Руслан Чарнецкі ахвотна адказаў на шматлікія пытанні. Вядома, напачатку прагучала пытанне пра тое, як акцёр наважыўся стаць дэпутатам.

— Я зразумеў, што галоўная мэта майго жыцця — дапамагаць людзям, — адказаў Руслан Чарнецкі. — Выкарыстоўваючы розныя шляхі. Як артыст я імкнуся дапамагчы гледачу стаць лепшым, даносячы словы класікаў. Калі чалавек становіцца кожны дзень крыху лепшым, гэта ж і ёсць шчасце! І якраз дэпутацкая пасада дае мне выдатную магчымасць дапамагаць людзям. Дэпутат жа не толькі законы піша, ён робіць шмат добрага, і не толькі для выбаршчыкаў са сваёй акругі. Для мяне гэта цудоўная магчымасць іншымі інструментамі дапамагаць людзям у жыцці, не толькі праз сцэну. Менавіта таму я і вырашыў пайсці па гэтым шляху. Лічу, што ў мяне гэта атрымаецца — і ўжо атрымліваецца.

Спыталі ў госця, як удаецца сумяшчаць столькі розных відаў дзейнасці: іграць у тэатры, здымацца ў кіно, займацца дэпутацкай працай... Руслан Чарнецкі адказаў, што галоўнае — шчырае жаданне нешта зрабіць, а яшчэ адказнасць і ўнутраная дысцыпліна. Цікавіла маладых, і як знайсці сябе, дасягнуць поспеху. У адказах Руслан Чарнецкі быў шчыры, распавёў, як у юнацтве сам шукаў сябе: па першай адукацыі ён аўтаслесар, адслужыў у арміі, працаваў афіцыянтам, ахоўнікам, займаўся спортам, танцаваў... Дарэчы, спорт з Русланам Іосіфавічам усё жыццё. Акцёр — кандыдат у майстры спорту па парусным спорце, сур'ёзна займаўся плаваннем, гуляў у футбол, баскетбол, валейбол, настольны тэніс, займаўся боксам і кік-боксінгам. Галоўнае — ён ніколі не спыняўся, не дазваляў сабе ленавацца і ўвесь час імкнуўся знайсці любімую справу, якой захочацца займацца ўсё жыццё. Бо калі ты займаешся любімай справай — ты шчаслівы чалавек, цябе не трэба гнаць на работу. Руслан Чарнецкі лічыць сябе шчаслівым. Таму і параіў маладым не спыняцца шукаць сябе, каб потым не пакутаваць на не любімай рабоце.

Распавёў госць і пра сваю сцэнічную работу — запрасіў не прапусціць новы спектакль Акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага «Горкі хлеб», дзе ён іграе. Спектакль таксама прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі.

— Гэта вельмі незвычайная пастаноўка. Прагучаць рэальныя гісторыі рэальных людзей, у якіх нічога не зменена. Гісторыі тых, хто ў дзяцінстве перажыў вайну. Мне гэта блізка. Я позняе дзіця, мая маці — 1939 года нараджэння, таму яна расказвала мне пра вайну гісторыі, падобныя да тых, якія мы сёння паказваем на сцэне. У нас шмат твораў пра герояў вайны, пра салдат, разведчыкаў... Але ці ўяўляем мы, што перажывалі ў той час маленькія дзеці, якім было пяць, сем, дзевяць гадоў? Гэта вельмі кранальны спектакль. Нават я, чалавек, які ведаў гэты матэрыял, рэпеціраваў яго, калі знаходзіўся на сцэне, ледзь стрымліваў слёзы. Спектакль дасць не толькі эмоцыі — прымусіць задумацца. Гэта для мяне і ёсць самае галоўнае.

Пасля размовы да госця выстраілася чарга па аўтографы, якія ў асноўным бралі на аркушыках з напісанай дыктоўкай. Хапала ахвотных і для фотасесіі з вядомым акцёрам і грамадскім дзеячам.

— Упэўнена, што тэкст дыктоўкі быў не толькі карысным для праверкі правапісу, але і інфарматыўным і пазнавальным, — зазначыла напрыканцы Вольга Губская. — Цікава было слухаць, як чытае тэкст акцёр Руслан Чарнецкі. Яго голас, расстаноўка акцэнтаў, інтанацыя сведчылі, што перад намі прафесійны артыст, які мог бы быць і добрым выкладчыкам. У любым выпадку, кантакт са студэнтамі быў знойдзены імгненна.

Людміла ІВАНОВА.

Ганаровыя місіі свята

Гэтымі днямі ветэраны Гродна прымалі асабістыя віншаванні ад прадстаўнікоў абласных і гарадскіх улад, дэпутацкага корпуса, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў. Адным з урачыстых момантаў стала ўручэнне юбілейных медалёў «80 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Фота grodnonews.by

Са слоў падзякі пачалася сустрэча **старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КАРАНІКА з ветэранам Уладзімірам КАЛЕСНІКАВЫМ**. Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што такая традыцыя для беларусаў была і застаецца самай важнай і знакавай. Сучаснае пакаленне памятае імёны воінаў, якія вынеслі ўсе цяжкасці вайны і, нягледзячы на ахвяры, выстаялі і заваявалі Перамогу.

— Памяць аб подзвігу беларускага народа з'яўляецца неад'емнай часткай нашай беларускай ідэнтычнасці і патрыятызму і будзе перадавацца дзецям і ўнукам, — падкрэсліў губернатар. — Мы зробім усё, каб вечны агонь памяці аб тых жудасных падзеях, аб героях, якія здабылі Перамогу, каб гэты агонь заўсёды гарэў у сэрцах беларусаў і ніколі не згасаў.

Уладзіміру Калеснікаву 97 гадоў, пайшоў на фронт у 16 у складзе запаснога батальёна. Першы бой прыняў пад Харкавам. Удзельнічаў у Берлінскай наступальнай аперацыі. Пасля вайны Уладзімір Фёдаравіч вырашыў звязаць свой лёс з ваеннай службай. Ветэран пажадаў усім прысутным добрага здароўя, шчасця і даў наказ быць патрыётамі сваёй краіны, любіць і абараняць Беларусь, як гэта рабілі іх дзяды і прадзеды. Менавіта таму вораг і быў разгромлены. А сёння для таго, каб забяспечыць моц сваёй краіны, усім трэба добра працаваць.

Па традыцыі госці разам з ветэранам выканалі песню «Дзень Перамогі» і пасадзілі ў двары, дзе пражывае ветэран, маладое дрэўца.

Любімую ўсімі песню выканала падчас віншавання **ветэран Валянціна БАРАНАВА**, якая летась адсвяткавала стагадовы юбілей. Напярэдадні 9 Мая да дому ў цэнтры Гродна завітала дэлегацыя на чале са **старшынёй Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Аленай ПАСЮТА**. Яна выказала словы шчырай удзячнасці гэтай стойкай і мужнай жанчыне, якая пайшла на фронт у 18 гадоў і баявы шлях прайшла ў якасці памочніка камандзіра ўзвода, начальніка змены ваенна-тэлеграфнай станцыі. Перамогу сустрэла ў Празе. Валянціна Пятроўна і сёння не губляе жыццёвага аптымізму і з'яўляецца прыкладам для моладзі ў справе служэння сваёй краіне.

Словы падзякі, кветкі і падарункі атрымала напярэдадні Дня Перамогі **старшына медыцынскай службы ў адстаўцы Марыя ПАТЛАЦЕНКА**. Жанчына ў даволі шаноўным узросце, два гады таму перасягнула стагадовы рубеж, але і сёння працягвае кантактаваць з моладдзю, гатова прыняць гасцей. Юбілейны медаль ёй уручыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Андрэй ЖУК**. А дэлегацыя на чале са **старшынёй гарадскога выканаўчага камітэта Андрэем ХМЕЛЕМ** віталa **ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны Івана НЯЎЗОРАВА**. Ветэран звязаў сваё жыццё з пагранічнай службай. Ён выказаў упэўненасць у тым, што і цяпер рубяжы яго краіны пад надзейнай абаронай.

Віншаванні і юбілейныя медалі атрымалі сем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Некаторыя з іх перасягнулі стагадовы ўзрост, астатнія набліжаюцца да яго. Для ветэранаў вельмі важная такая ўвага з боку улад, грамадскасці, моладзі. Па словах **удзельніка вайны Леаніда ДАНІЛАВА**, гэта надае ім упэўненасці у тым, што Перамога жыве ў нашчадках, а ахвяры іх пакалення былі не дарэмнымі. Усе ветэраны павіншавалі сваіх гасцей з надыходзячым агульным святам і далі наказ жыць мірна. Падчас святочнай цырымоніі гучалі песні ваенных гадоў, усе прысутныя выконвалі песню «Дзень Перамогі», якая стала сапраўдным сімвалам аб'яднання некалькіх пакаленняў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У ГОСЦІ ДА ГЕРОЯ

На Гомельшчыне да Дня Перамогі правялі надзвычай цёплыя, кранальныя акцыі віншавання ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых вязняў канлагераў, працаўнікоў тылу.

Фота ТК «Гомельскія вобласныя ведамасці».

Шчырыя словы падзякі і віншаванні **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ГОРЛАЎ** адрасаваў **ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Аляксею ГАЛАВАЦКАМУ**. Падчас імправізаванага парада каля дома героя Юрый Горлаў уручыў Аляксею Аляксандравічу нагрудны знак «80 гадоў вызвалення Гомельскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Знакаміты жыхар Гомельшчыны — Аляксей Галавацкі — сустрэў вайну 16-гадовым юнаком. Яму давялося быць кулямётчыкам у партызанскім атрадзе. Пасля герой вайны ўдзельнічаў у ліквідацыі бандыцкіх груповак на тэрыторыі Заходняй Украіны. У складзе 1-га Беларускага фронту Аляксей Аляксандравіч дайшоў да Берліна. Аб гераічным шляху ветэрана сведчаць яго шматлікія ўзнагароды.

— Вы разам са сваімі паплечнікамі падарылі нам цудоўную сучаснасць, у якой мы цяпер жывём. Ад сябе асабіста, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, кіраўніцтва Гомельскай вобласці жадаю вам доўгіх гадоў жыцця. Дзякуй за ваш подзвіг! — звярнуўся да героя Вялікай Перамогі памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Горлаў. — Калі забудзем пра мінулае, то ў нас не будзе сучаснасці, не будзе будучыні. І чым больш праўды мы будзем ведаць пра подзвігі нашых герояў, пра вашы подзвігі, Аляксей Аляксандравіч, тым больш будзе яднацца наш беларускі народ, будзе больш загартаваным і згуртаваным, каб не дапусціць агрэсараў на нашу святую зямлю, якая была адваяваная вамі і вашымі братамі па духу. Вы з'яўляецеся для нас вялікім прыкладам, гонарам для ўсяго беларускага народа. Хочацца, каб наша моладзь раўнялася на вас.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПАД ГУКІ ПЕРАМОЖНАГА МАЯ

Напярэдадні Дня Перамогі ў Магілёве адразу па некалькіх адрасах гучна, урачыста і святочна віталі ветэранаў. Пад іх вокнамі гучалі бадзёрыя рытмы ваеннага марша, курсанты чаканілі крок, дэманструючы выключную выпраўку, і віталі былых франтавікоў трохкратным «ура». Дзяўчаты дарылі ўсмешкі і кветкі, запускалі ў мірнае неба паветраныя шары. І кожны шчыра жадаў, каб сёлетні май быў для гэтых мужных людзей такім жа шчаслівым і ўрачыстым, як і той, пераможны, амаль 80 гадоў таму.

Магіляўчанін Міхаіл ЦІТОЎ («Звязда» пісала пра гэтага адважнага ветэрана летась у нумары ад 5 мая ў праекце «Відавочца Перамогі») 17-гадовым хлопцам граміў ворага ў складзе 346-га партызанскага атрада. Адважны герой прыняў удзел у дзевяці дыверсіях, знішчаў камунікацыі ворага, пускаў пад адхон варожыя цягнікі. У 1944-м у якасці аўтаматчыка 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі 3-га Беларускага фронту вызваляў Усходнюю Прусію. Пад Кёнігсбергам атрымаў цяжкае раненне і Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі. За мужнасць і гераізм Міхаіл Цітоў узнагароджаны ордэнам «Айчыннай вайны I ступені», медалямі «Партызан Айчыннай вайны», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За Перамогу над Германіяй».

Гады даюць сваё, але ветэран трымаецца бадзёра. І гасцей сустракаў каля пад'езда свайго дома, пешшу спусціўся з пятага паверха, а потым разам з кіраўніцтвам горада і іншымі ганаровымі гасцямі яшчэ раз пераадолеў гэты шлях. А перад гэтым ён даў наказ маладым людзям, якія прыйшлі яго павітаць:

— Трэба вучыцца і быць моцнымі і здаровымі. А каб было здароўе, трэба добра харчавацца і мець і фізічную нагрузку.

Міхаіл Цітоў паведаміў, што 9 Мая прыме ўдзел у парадзе, а потым паедзе на летнік у вёску. У якасці садавода-аматара вырошчвае там персікі, абрыкосы, слівы, вішні, чарэшню, яблыкі і, вядома, бульбу. Бо, як трапна заўважыў ветэран: які ж гэта беларус, у якога няма бульбы.

Не менш ветліва сустракаў гасцей **Андрэй АНДРЭЙЧЫКАЎ** (публікацыя пра ветэрана ў «Звяздзе» ад 2 студзеня 2024 года). Падцягнуты, у баявой гімнасцёрцы — ён усім сваім відам сімвалізуе нязломнасць і непахіснасць. Падлеткам перажыў акупацыю, быў відавочцам баёў за Магілёў. У 1944 годзе трапіў на фронт у якасці пехацінца, прайшоў усю Польшчу, дайшоў да Берліна. Дзень Перамогі сустрэў таксама ў шпіталі. У баі, дзе ён атрымаў раненне, амаль ніхто не выжыў. За мужнасць і гераізм ветэран адзначаны баявым ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі». Сярод працоўных узнагарод Андрэя Андрэйчыкава — медаль «За доблесную працу» і Ганаровы знак «Ветэран працы».

Маргарыту ІКУСАВУ віншавалі наогул рамантычна — ва ўпрыгожанай колерамі дзяржаўнага сцяга люльцы пад'ёмніка. Пад урачыстыя гукі духавога аркестра малады чалавек у гімнасцёрцы перадаў жанчыне букет кветак. Удзельніцу баёў віталі вучні ваенна-патрыятычных класаў, дзяўчаты са сцяжкамі і паветранымі шарамі, курсанты.

Маргарыта Васільеўна пайшла на фронт у 1942 годзе, калі ёй споўнілася 17 гадоў. На працягу дзевяці месяцаў навучалася ў школе малодшых авіяспецыялістаў, атрымала ваенную спецыяльнасць радыётэлеграфіста. Ваявала ў складзе 26-га асобнага ордэна Чырвонай Зоркі палка сувязі. Прымала ўдзел у вызваленні Данбаса, Днепрапятроўска, Крывога Рога, Адэсы, удзельнічала ў баях за Малдавію. Перамогу сустрэла ў горадзе Мёдлінгу пад Венай. Сярод узнагарод — ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За ўзяцце Будапешта», «За ўзяцце Вены», «За вызваленне Украіны», «За Перамогу над Германіяй».

Вучань ваенна-патрыятычнага класа 12-й школы Міхаіл Варфаламееў, які ўдзельнічаў у віншаваннях ветэранаў, прызнаўся, што для яго гэта вельмі ганаровая падзея. Юнак удзячны ветэранам за Перамогу, за магчымасць жыць у мірнай краіне. Сваё жыццё збіраецца звязаць з ваеннай справай, працягваць ганаровую місію па ахове міру на роднай зямлі.

Усім ветэранам, якіх напярэдадні вялікага свята Дня Перамогі наведалі прадстаўнікі ўлады, курсанты, моладзь, быў уручаны юбілейны медаль «80 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

— Для былых франтавікоў гэта самае важнае свята на зямлі, — адзначыў **ваенны камісар Магілёва і Магілёўскага раёна палкоўнік Максім УЛАСАЎ**. — Яны перажылі жахі вайны, боль успамінаў ад якіх заўсёды ў іх сэрцы. Дзякуючы ім мы сёння жывём пад мірным небам і можам цаніць тыя дробязі жыцця, на якія часам нават не звяртаем увагі.

Разам з узнагародамі ветэраны атрымалі каштоўныя падарункі ад кіраўніцтва горада, Міністэрства абароны, арганізацый раёна.

Шмат цёплых слоў у іх адрас прагучала з вуснаў мэра Магілёва Аляксандра Студнева і старшыні Магілёўскага гарсавета Максіма Гурына. Яны пажадалі былым франтавікам здароўя і заставацца прыкладам мужнасці і вытрымкі для маладога пакалення.

Па інфармацыі абласной ветэранскай арганізацыі, на 1 студзеня ў Магілёўскай вобласці з ліку ветэранаў вайны пражывала 98 чалавек, з якіх 37 — у Магілёве і 27 — у Бабруйску.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

З ДНЁМ ПЕРАМОГІ

Вясновы клопат

СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ДАПАМОГУ

Як правяла пасяўную кампанію гаспадарка-пераможца па выніках мінулага года

СВК «Азёры Гродзенскага раёна» ў чаканні першага ўкосу шматгадовых траў. Вясновы сеў збожжавых і зернебабовых культур тут завершаны поўнасцю. І хаця сёлета аўралаў не назіралася, пасяўныя агрэгаты шчыравалі на палях дапазна.

У **старшыні Аляксандра ШЫШКО** настрой, па ўсім відаць, добры. Яно і зразумела. Нядаўна ў гаспадарку прыйшла прыемная навіна: СВК «Азёры Гродзенскага раёна» па выніках работы за мінулы год занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару. Вытворчы кааператыў дабіўся добрых эканамічна-фінансавых паказчыкаў, мае годны прыбытак. Напрыклад, надоі тут летась дасягнулі 10,5 тысячы тон на карову. І ў жывёлагадоўлі, і ў раслінаводстве маецца добры вытворчы патэнцыял.

— Дарэчы, мы не першы раз занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару, і кожны раз гэта вельмі прыемна. Такі факт натхняе мяне як кіраўніка, ды і ўвесь калектыў. Усе ведаюць, што на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску ёсць шыльда з назвай нашай гаспадаркі. А гэта важны стымул у рабоце. Узнімае рабочы настрой, — не хавае эмоцый старшыня.

У кіраўніка заўсёды шмат клопатаў, разам з тым важны фронт работ, можна сказаць, пройдзены. Пасяўная кампанія завершана, увесь збожжавы клін пасеяны, у тым ліку і кукуруза.

— Мы ўбралі зялёнае жыта на сянаж і там пасеялі кукурузу, усе работы па абароне раслін таксама праведзены, рыхтуемся да ўборкі траў першага ўкосу, — расказаў Аляксандр Шышко.

Якія сёлетняя вясна прынесла сюрпрызы? Аграрыі, як вядома, у пэўнай ступені залежаць ад кліматычных нюансаў, асабліва падчас пасеву і ўборкі. Суразмоўца пагаджаецца, што вясна, якая выдалася сёлета, аказалася з характарам. Цёплыя дні змяняліся рэзкім пахаладаннем. Вось і цяпер надвор'е сапсавалася, ноччу абяцаюць нават замаразкі. Разам з тым за свае палі старшыня спакойны. Усе пасевы, дзякуючы сістэмнай рабоце, адпавядаюць тэхналагічным нормам. Зацяжная вясна прыпыняла пасеў кукурузы, але тэрміны не ўпушчаны.

Фота прадастаўлена СВК "Азёры Гродзенскага раёна".

Трактарыст-машыніст СВК «Азёры Гродзенскага раёна» Уладзіслаў БЯЛЯЎСКІ.

СВК «Азёры Гродзенскага раёна» па выніках работы за мінулы год занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару. Вытворчы кааператыў дабіўся добрых эканамічна-фінансавых паказчыкаў, мае годны прыбытак. Напрыклад, надоі тут летась дасягнулі 10,5 тысячы тон на карову.

— Я, можа, і пахвалюся, але з года ў год пасяўная кампанія праходзіць як планавыя работы, нам удаецца пазбегнуць аўралаў. Мы правялі значную папярэднюю работу. Адрамантавана ўся неабходная тэхніка, механізатары падрыхтаваны. У сваю чаргу, гаспадарка арганізавала гарачае харчаванне — не толькі абеды, але і вячэра, бо працавалі дапазна. Між тым мелі і выхадны: у нядзелю, напрыклад, не працавалі. Усё паспелі зрабіць у вызначаны тэхналагічны тэрмін. Нават бульбу на прысядзібных участках пасадзілі, — радуецца суразмоўца.

Хуткія тэмпы вясенніх работ звязаны з тым, што значны задзел быў зроблены восенню. Многія гаспадаркі робяць стаўку на азімыя культуры. СВК «Азёры» не выключэнне. Напрыклад, тут адмовіліся ад яравога ячменю. Яго ўраджайнасць часта падводзіла, таму поўнасцю перайшлі на азімы.

Ходу работ садзейнічала і новая тэхніка. Для пасеву тут пачалі прымяняць адносна новы метад апрацоўкі глебы — тэхналогію strip-till. Работы вядуцца спецыяльным агрэгатам, які аб'ядноўвае адразу некалькі працэсаў.

— Летась мы набылі такі камбінаваны агрэгат, і ён добра сябе паказаў падчас пасеву азімых культур. Тэхніка выконвае некалькі аперацый, не патрабуе папярэдняй апрацоўкі глебы. Адразу пасля ўборкі ўраджаю можна прыступаць да новай пасяўной. Не трэба асобна араць, культываваць, уносіць угнаенні, рабіць перадпасяўную апрацоўку і толькі пасля гэтага сеяць. Агрэгат адначасова апрацоўвае глебу, уносіць угнаенні і сее. Па гэтай тэхналогіі сёлета мы пасеялі даволі значны аб'ём збожжавых культур, у тым ліку і кукурузы. Мы вельмі задаволены гэтым агрэгатам, і лічу, што за ім будучыня. Асабліва гэта датычыцца нашай пясчанай глебы, бо мы не варочаем зямлю, не ствараем пясчаныя буры, — дзеліцца старшыня СВК «Азёры».

У Гродзенскім райвыканкаме таксама станоўча ацэньваюць укараненне тэхналогій strip-till у пасяўны працэс. Па словах **першага намесніка старшыні райвыканкама, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Віктара КЕМЕЖУКА**, такіх агрэгатаў у раёне ўжо чатыры. І парк пастаянна папаўняецца. З іх дапамогай работа вядзецца ў больш сціслы тэрмін. У цэлым па раёне пасяўная кампанія амаль завершана, сеюцца, можна сказаць, апошнія гектары.

— Пасевы вядуцца на тых палях, дзе сёлета скошаны кармавыя культуры — азімае жыта і свірэпіца. Гэта прамежкавыя культуры, якія сеюцца восенню і растуць да пачатку пасяўной. Яны вельмі важныя для сенажу з-за ўтрымання цукру і пратэіну. Такім чынам, мы маем два ўраджаі ў год. Многія гаспадаркі практыкуюць такі падыход. Ён актуальны тым, што дазваляе здымаць больш адзінак з гектара, што павялічвае эфектыўнасць поля. Гэта па-сапраўднаму інтэнсіўнае земляробства, — тлумачыць кіраўнік раённага звяна.

Як і СВК «Азёры», гаспадаркі раёна значную частку пасеваў адводзяць пад азімыя культуры. Напрыклад, у цэлым па раёне плошча азімых збожжавых займае больш за 70 %. Вопыт паказвае, што іх патэнцыял вышэйшы, да таго ж яравыя культуры трапляюць пад летнюю засуху, а азімыя да гэтага часу паспяваюць развіцца. А вось кукуруза сеецца толькі вясной. І гэта культура вельмі важная для раёна. Напрыклад, сёлета ўводзяцца новыя фермы, таму ўзрасце і патрэба ў кармах. Пасевы гэтай культуры зніжаць не плануюць.

Ходу работ садзейнічала і новая тэхніка. Для пасеву тут пачалі прымяняць адносна новы метад апрацоўкі глебы — тэхналогію strip-till. Работы вядуцца спецыяльным агрэгатам, які аб'ядноўвае адразу некалькі працэсаў.

— Тэмпы работы сёлетняй пасяўной кампаніі ў раёне даволі высокія. Мы падышлі да яе падрыхтаванымі. Разлічваем на добры вынік. Збожжа максімальна вырошчваецца для сваіх патрэб, для жывёлагадоўлі, што павялічвае прыбытак. Для паляпшэння кармавой базы пашыраюцца плошчы пад кармавыя культуры. Значная ўвага — люцэрне. Гэта найбольш устойлівая бабовая культура, якая можа даць тры-чатыры, а то і пяць ураджаяў за год. Закупляем насенне самых прадукцыйных сартоў. І, вядома, не зніжаецца актуальнасць рапсу. Летась мы атрымалі па ім 70 % рэнтабельнасці, — расказаў Віктар Кемяжук.

Ці зможа раён дасягнуць мінулагодняга рэкорднага ўраджаю збожжавых і зернебабовых, пакуль казаць рана. Летась тут атрымалі 78,7 цэнтнера з гектара. Паспелі сабраць да дажджоў, своечасова. Але кожны год не бывае такім прадукцыйным, кажа Віктар Віктаравіч. Таму тут пакуль узялі за аснову ўраджайнасць за апошнія тры гады. Разам з тым у раёне разлічваюць, што і сёлетні год не будзе горшы за леташні, пасевы пакуль што радуюць.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ААН лічаць, што на аднаўленне Газы спатрэбіцца больш за $40 млрд

Дырэктар рэгіянальнага бюро Праграмы развіцця ААН (ПРААН) для арабскіх краін Абдула аль-Дардары заявіў, што аднаўленне сектара Газа, які панёс істотную шкоду падчас палесцінаізраільскага канфлікту, паводле папярэдніх ацэнак, зойме дзесяцігоддзі і абыдзецца больш чым у $40 млрд. Паводле яго слоў, у Газе неабходна прыбраць каля 37 мільёнаў тон цвёрдых адходаў, больш чым 70 працэнтаў дамоў тут разбурана. Паводле яго слоў, такіх маштабных разбурэнняў за такі кароткі перыяд часу яшчэ не было. «Маштабы разбурэнняў каласальныя і беспрэцэдэнтныя. Міжнародная супольнасць не сутыкалася з падобнай задачай з часоў Другой сусветнай вайны», — заявіў Абдула аль-Дардары. У апублікаваным раней дакладзе ПРААН указваецца, што памер шкоды, нанесенай інфраструктуры сектара Газа, роўны 97 працэнтам гадавога ВУП Палесціны.

Маск назваў нелегальную іміграцыю «рэцэптам катастрофы» для ЗША

Нелегальнае пападанне ў ЗША вялікай колькасці неправерaных мігрантаў — гэта «рэцэпт катастрофы» для краіны. Аб гэтым заявіў бізнесмен Ілан Маск. «Я за паскарэнне працэсу легальнай іміграцыі, але таксама за бяспеку паўднёвай граніцы», — сказаў ён, выступаючы на канферэнцыі ў Інстытуце Майкла Мілкена, якая праходзіць у горадзе Лос-Анджэлес, паведамілa ТАСС. Маск ахарактарызаваў легальную іміграцыю ў ЗША як «кафкіянскі, доўгі, дзіўны працэс». «Пры гэтым можна вельмі проста перамахнуць праз паўднёвую граніцу. Гэта вар'яцтва», — адзначыў мільярдэр. Маск неаднаразова крытыкаваў міграцыйную палітыку дзейнай амерыканскай адміністрацыі. На яго думку, улады ЗША нічога не робяць, каб прадухіліць злачынствы нелегальных мігрантаў у краіне. Маск таксама сцвярджаў, што Злучаным Штатам настане канец, калі Вашынгтон не зменіць міграцыйную палітыку.

У Германіі прапанавалі паставіць на ўлік усіх прыдатных да ваеннай службы

Саюз вайскоўцаў Бундэсвера лічыць неабходным паставіць на ўлік усіх асоб, прыдатных да ваеннай службы. Такое меркаванне выказаў кіраўнік аб'яднання, палкоўнік Андрэ Вюстнер у эфіры тэлеканала ARD. У якасці першага кроку, паводле яго слоў, Бундэсверу неабходна магчымасць вызначыць, хто прыдатны да ваеннай службы. «Я проста заўважаю, што цяперашніх канцэпцый недастаткова, калі размова ідзе аб камплектаванні асабовага саставу, нават з улікам рэзерву», — канстатаваў кіраўнік Саюза ваеннаслужачых. У прыватнасці, Бундэсверу павінна быць дадзена магчымасць збіраць даныя аб усіх асобах, прыдатных да ваеннай службы, каб можна было інфармаваць іх аб службе ў Бундэсверы. Раней Мінабароны ФРГ паведаміла, што колькасць кадравага саставу Бундэсвера скарачаецца другі год запар. У 2022 годзе шэрагі нямецкай арміі пакінулі 19,5 тысячы ваеннаслужачых, яшчэ звыш 4,2 тысячы ваенных датэрмінова выйшлі ў адстаўку.

ГЭТАЕ СВЯТА ЗАЎЖДЫ БЫЛО АСАБЛІВЫМ — І ПРЫ ЖЫЦЦІ ДЗЯДУЛІ, І ЦЯПЕР

Вайна... Само гэта слова ў некага выклікае страх, у некага — балючыя ўспаміны, а то і слёзы. Маё пакаленне ведае пра яе з кніг, дакументальнай хронікі, з мастацкіх фільмаў і расказаў родных.

З прадзедам Васілём Аляксандравічам Мартосам, ураджэнцам в. Круты Бераг Нясвіжскага раёна, мы, калі можна так сказаць, размінуліся ў часе: мне было шэсць месяцаў, калі ён памёр. А нарадзіўся — у 1909-м у невялікай па тым часе вясковай сям'і, дзе былі яшчэ брат і дзве сястры. Прадзед — найстарэйшы, а значыць, ён, калі не стала бацькі, адбудоўваў пасля пажару хату, карчаваў пні, каб павялічыць надзел зямлі, перавозіў сям'ю то на хутар, то назад у вёску.

У 1936 годзе гэты малады гаспадар ажаніўся (па словах бабулі, «у пятніцу пасля Сёмухі»), каб пражыць у шлюбе 62 гады, нарадзіць пяцярых дзяцей (траіх, на жаль, пахаваць) і пры гэтым самым страшным выпрабаваннем для сям'і і ўсёй вялікай краіны лічыць менавіта вайну.

...Пра жыццё пад акупацыяй ні прадзед, ні прабабуля распавядаць не любілі. Успаміналі толькі, што іх старэйшая дачушка Люся, першы раз убачыўшы немцаў, страшэнна спужалася, захварэла і ў чатыры гадкі памерла.

У рады Чырвонай Арміі Васіля Аляксандравіча прызвалі ў 1944-м. З сям'ёй развітваўся са слязамі на вачах: баяўся, што болей не ўбачыць, што без яго абы-якімі могуць вырасці сыны — сямігадовы Саша і аднагадовы Антон.

(Развітанне... Мо назусім... Скупыя мужчынскія слёзы... Маленькія ручкі дзяцей у вялікіх агрубелых ад працы бацькавых... Варта ўявіць, і таксама заплачаш.)

Потым была «вучэбка» ва ўкраінскім Оўручы, служба ў 140-й стралковай дывізіі...

Гэтую інфармацыю мы адшукалі пасля смерці прадзеда на сайце «podvignaroda.ru» і даведаліся, за якія асаблівыя заслугі (радавым інакш не давалі) прадзед быў прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі. Цытата: «Тав. Мартос, выконваючы абавязкі сувязнога пры аддзеле тылу, заўсёды, у любы час дня і ночы дастаўляў баявыя загады часцям дывізіі і начальнікам службаў. У баях за Савецкую Радзіму ў раёне Карпат быў цяжка паранены...»

З дакумента зразумела, што камандзір пісаў хадайніцтва, а якую ўзнагароду атрымае баец, дапісана пасля. Пацверджаннем таму яшчэ адзін рассакрэчаны дакумент — загад па 140-й стралковай дывізіі ад 14 верасня 1945 г. аб узнагароджанні ордэнам Чырвонай Зоркі радавога Мартоса Васіля Аляксандравіча, стралка камендацкага ўзвода: «За ўзорнае выкананне баявых заданняў... і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць».

Пра адзін з выпадкаў прадзед успамінаў. Неяк, даставіўшы пакет дакументаў, пачуў ад афіцэра надзвычайныя словы падзякі!

(Можа, дакументы былі нейкай асаблівай важнасці, а можа, у штабе ўжо не спадзяваліся іх атрымаць?)

Быў яшчэ і медаль «За баявыя заслугі», паводле дакументаў: «За спыненне контратакі праціўніка і атрыманае ў выніку раненне».

...Вайну мой прадзед закончыў на тэрыторыі Чэхаславакіі (дакументальных пацвярджэнняў гэтаму ў сямейным архіве, на жаль, няма) і ўжо ў мірны час атрымаў Ордэн Айчыннай вайны другой ступені.

Пра тое, як ваяваў, прадзед амаль не расказваў: лічыў, што кожнае пакаленне «нясе свой крыж», на яго долю выпала вайна... А вось пра баявых таварышаў-землякоў (ваяваў разам з Барысам Турко з в. Завітая) заўсёды гаварыў з цеплынёй. Гэтыя дзве «прыгоды», па словах мамы, гучалі найчасцей.

На паверцы малады лейтэнанцік заўважыў у дзядулі нацельны крыжык і загадаў неадкладна зняць. Баец (ну, вядома ж, рызыкуючы трапіць пад трыбунал) адказаў, што ён гэтага рабіць не будзе — «сам здымай»... Лейтэнанцік не адважыўся...

Хутчэй за ўсё ён быў камуністам, але ж у акопах, як кажуць, не бывае бязбожнікаў: у душы, пэўна, кожны верыў у найвышэйшыя сілы, якія засцерагуць, дапамогуць не страціць мужнасці, справіцца з ворагам, вярнуцца дамоў.

І яшчэ. Нарадзіўшыся ў пачатку мінулага стагоддзя ў вёсцы, Васіль Аляксандравіч не слухаў радыё, не глядзеў тэлевізар, бо іх не было, і таму з цікавасцю назіраў за людзьмі іншых нацыянальнасцяў; распавядаў пра тое, як байцы, штодня назіраючы кроў і смерць, стараліся падтрымліваць адзін аднаго, не ачарствець душой...

Прадзед, у прыватнасці, часта ўспамінаў пра мусульманіна, які не раз адмаўляўся ад ежы, бо яму нельга было ўжываць свініну... А ў народзе ж не дарэмна кажуць, што чалавек галодны ні на што не годны: ваяваць — і пагатоў! Таварышы па зброі прыдумалі выйсце: з кавалачкаў мяса здымалі сала (каб не разабраць было, чым запраўлена каша) і перадавалі кацялок байцу. На пытанне «Свін?» упэўнена казалі: «Не!» і потым ведалі, што іх таварыш падсілкаваўся, не застаўся галодным.

Ці не ў гэтым заключаецца сапраўдная сяброўская падтрымка? Ці не гэта паказчык чалавечнасці?

...Дзядуля заўсёды (пакуль меў сілы) з вялікім задавальненнем хадзіў на святочныя мерапрыемствы да дня Перамогі, сустракаўся з такімі ж ветэранамі. Яны разам слухалі словы віншаванняў і ўдзячнасці, ушаноўвалі памяць загінулых, паміналі іх баявымі ста грамамі. І ў сям'і гэтае свята заўсёды было асаблівым — як пры жыцці дзядулі, так і цяпер.

Чаму? Думаю, таму, па-першае, што амаль не засталося ветэранаў, удзельнікаў вайны, а значыць, няма каму падзяліцца ўсім тады перажытым; а па-другое, свет вы жыццё вакол нас такія неспакойныя...

Тым больш шчырай і важкай павінна быць удзячнасць нашым папярэднікам за тое, што перамаглі, за тое, што амаль восемдзясят гадоў людзі маюць магчымасць жыць пад мірным небам, не прачынацца ад выцця сірэн, ад выбухаў і пажараў.

...Мой прадзед Васіль Аляксандравіч Мартос пражыў доўгія 94 гады. Людзі вельмі паважалі яго, бо з адукацыяй «дзве зімы» (па сённяшніх мерках — ніякай) ён вельмі шмат чаго ведаў і ўмеў (тагачасны старшыня калгаса «17 верасня» заўсёды раіўся з ім, калі сеяць і пачынаць жніво, як лепш захаваць ураджай).

Пасля выхаду на заслужаны адпачынак прадзед яшчэ дзесяць гадоў працаваў фуражырам, стаў заслужаным калгаснікам (адмысловую ганаровую стужку разам з іншымі ўзнагародамі захоўвае мая бабуля Марыя).

І дома ў прадзеда ўсё было па-людску: кароўка (а то і дзве), свінні, гусі, куры, зямельны надзел, які абрабляўся ўручную,

Прадзед жыў «пад Польшчай», прайшоў дарогамі вайны, што называецца, на сабе адчуў, што такое калектывізацыя, гады перабудовы. Але дакладна ведаў: не часы вызначаюць учынкі чалавека, а чалавек сам: яго людскасць, яго душа і яго прынцыпы. Васіль Аляксандравіч ніколі не казаў, што не той узрост і не тое здароўе: кожны дзень яго быў у клопатах і справах. І для нас, яго наступнікаў, гэта стала прыкладам для выбару кім быць і якімі быць.

...Жыццё не стаіць на месцы. Новы час прыносіць новыя выпрабаванні, новыя перамогі, новых герояў. Але кожнае пакаленне спраўляецца з выклікам, у першую чаргу дзякуючы таму, што пераймае вопыт старэйшых.

Мой прадзед — звычайны чалавек, якіх тысячы, але я дакладна ведаю, што менавіта яго ўнутраны стрыжань, яго прынцыпы, яго характар, яго працавітасць былі прыкладам для многіх — у сям'і, у радні, сярод аднавяскоўцаў.

Сын і ўнук майго прадзеда выбралі прафесію вайскоўца і з гонарам служылі, захоўваючы мір і шчасце на роднай зямлі. Мая мама — настаўніца. Гэтую ж прафесію выбрала я. Вучуся, стараюся быць годным чалавекам, захоўваць сямейныя каштоўнасці і памяць продкаў.

Валерыя Русак, студэнтка, *г. Мінск.*

P.S. *Фотаздымак дзядулі не найлепшай якасці, але ўсім нам вельмі дарагі, бо адзіны з часоў вайны.*

Памяць

«Цяжка прыйшлося, аднак людзі змагаліся і цярпелі, не здаваліся»

Сёлета 80 гадоў з дня вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое дасталася вельмі дарагой цаной і ў якім важную ролю адыграў партызанскі рух. Удзел у ім бралі мае бацькі Ганна Паўлаўна і Канстанцін Дзмітрыевіч Берднікі. Толькі пажаніўшыся, яны жылі за сотні кіламетраў ад Мінска, у невялікім гарадку Капыль, чакалі першынца.

Калі пачалася вайна, Косця накіраваўся ў ваенкамат, але там ужо ішла эвакуацыя. Тату ды іншым хлопцам-мужчынам параілі самастойна шукаць нашы войскі. З надзеяй сустрэць рэгулярныя часці група рушыла ў бок Мінска і праз пару дзён, на падыходзе да сталіцы, даведалася, што ў горадзе немцы... Абходнымі шляхамі прыйшлося вяртацца назад.

У верасні 1941-га ў маладой сям'і нарадзіўся сын. У пачатку 1942-га фашысты сталі настойліва вербаваць нашых мужчын у паліцаі, і ў той жа час у лясах Капыльшчыны пачалі стварацца партызанскія атрады. Ганна і Канстанцін вырашылі пайсці туды разам (маладой матулі з дзіцем небяспечна было заставацца дома). Пад выглядам збораў на палявыя работы сям'я загрузілася ў воз і дабралася да партызанскага атрада.

Косцю адразу прызначылі ў конную разведку, Ганна займалася гаспадаркай. Цяжка прыйшлося, аднак людзі змагаліся і цярпелі, не здаваліся, бо вораг прыйшоў на нашу зямлю, каб зрабіць нас рабамі.

У час адной з бамбёжак Ганна, прыкрываючы сабою дзіця, была параненa. Косця, вяртаючыся з заданняў, здаралася, паказваў ёй у некалькіх месцах прастрэленую шапку.

...Дзеці, унукі Ганны Паўлаўны і Канстанціна Дзмітрыевіча *(на здымку)* ведаюць гэта па расповедах бацькоў і дзядоў. Наступныя ж пакаленні павінны не толькі захаваць гэту памяць, але і перадаць далей.

Сяргей Берднік, сын.

г. Мінск.

Свой погляд

Пасееш прывычку — пажнеш характар...

У салонах магілёўскіх аўтобусаў і тралейбусаў часта назіраю такую карціну: у пярэднія дзверы заходзіць нехта старэнькі, з кавенькай, азіраецца — шукае вачыма, дзе б прысесці, а месцы (нават з пазнакай для інвалідаў) занятыя хлопцамі і дзяўчатамі, маладымі жанчынамі і мужчынамі. Уткнуўшыся ў свае смартфоны, яны нікога вакол не бачаць... Здаралася, я нават задаваў пытанне: «Можа, хто з «інвалідаў» уступіць месца бабулі?» Вось тады ўжо нехта ўставаў.

Раней, помніцца, кіроўцы і кандуктары звярталіся да пасажыраў з аб'явамі, з напамінамі, як трэба сябе паводзіць. Апошнім часам такіх зваротаў нешта не чуваць. Маладыя людзі спакойна займаюць месцы, спакойна едуць, і прычыну гэтага я разумею. Нашы дзеці і ўнукі змалку прывыкаюць да таго, што ўсё найлепшае аддаецца ім... А вось у народаў Каўказа ці не ў крыві — павага да старэйшых.

Як гэта выхоўваецца, раскажу на канкрэтным прыкладзе. Аднойчы я зайшоў у вагон цягніка, які ішоў у Баку. Сесці не было дзе: усе месцы занятыя, аднак мужчына гадоў сарака штурхнуў пад локаць хлапчука (трэба разумець, стаўшага сына... Побач сядзелі трое малых) і моўчкі загадаў устаць.

Я хацеў спыніць хлопчыка, сказаў, што мне зусім няцяжка — магу пастаяць. Але бацька ўжо мне ціха загадаў: «Сядайце. Так трэба... Потым скажу, навошта».

І сапраўды, калі мы дабраліся да месца, гэты шматдзетны азербайджанец на некалькі крокаў адвёў мяне ад малых і сказаў: «Ведаеце, у вагоне я клапаціўся не столькі пра вас... Я хачу, каб мае дзеці з павагай ставіліся да людзей пажылых — і сваіх, і чужых... Калі сёння мой сын не ўступіць месца вам, калі ён не прывыкне паважаць старэйшых, то падрасце і не будзе паважаць мяне».

Вось такі, можна сказаць, асабісты інтарэс, вось такая народная мудрасць. Не грэх бы яе засвоіць і нам.

Віктар Арцём'еў, *г. Магілёў.*

Чалавек — чалавеку

З НАДЗЕЯЙ...

Я ведаю лекі ад грубага слова,
Ад думак маркотных,
ад страху і стрэсу,
Ад кроку спантаннага,
выпадку злога...
Усмешка — ахоўнік маіх інтарэсаў.

Аддаць задарма —
не шкада абсалютна!
Я з ёй адчуваю сябе аптымісткай
У лесе ціхуткім,
натоўпе шматлюдным,
Прыгожай і смелай,
як тая ж артыстка!

Мой твар
упрыгожыць яна без памады,
Асветліць пакой
у любое надвор'е,
Пакіне каханаму ціхую радасць
І можа, у адказ мне —
усмешак сузор'е?

Алена Бельская,

г. Маладзечна.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
8 мая 2024 г. № 18 (751)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ

АБАВЯЗАК БЕЛАРУСАЎ — НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПАДОБНАГА

Напярэдадні Дня Перамогі члены Савета Рэспублікі ўсклалі кветкі да месцаў масавага знішчэння людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны

КАЛІ на мемарыяльным комплексе «Масюкоўшчына», узведзеным у памяць аб звыш 80 тысяч ваеннапалонных, якія ў гады акупацыі Беларусі загінулі ў «Шталагу-352», сенатары і супрацоўнікі сакратарыята верхняй палаты парламента бываюць рэгулярна, то месца масавага пахавання ахвяр генацыду ва ўрочышчы Уручча заканатворцы наведалі ўпершыню. Такім чынам, Уручча — гэта не толькі назва сучаснага сталічнага мікрараёна. Гэта яшчэ адзін сімвал болю беларускага народа, месца жудаснай расправы нацысцкіх злачынцаў над ні ў чым не вінаватымі людзьмі, сярод якіх не толькі ваеннапалонныя, а і мірныя жыхары — пераважна жанчыны і дзеці.

Фота Віктара ІВАНЬКАВА.

Аб тым, што ў лясным масіве каля Мінска гітлераўцы і іх памагатыя знішчылі вялікую колькасць людзей, стала вядома адразу пасля вызвалення Беларусі. Акт Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, датаваны ліпенем 1944 года, сведчыў: тут было знішчана звыш 57 тысяч грамадзян. У памяць аб бязвінна расстраляных савецкіх воінах, партызанах і мірных людзях у 1959 годзе на 9-м кіламетры маскоўскай шашы з'явіўся мемарыял. Аднак рэальны маштаб трагедыі ўдалося ўстанавіць толькі нядаўна, калі ў красавіку 2021 года Генеральная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Па папярэдніх ацэнках, у лясным масіве ўрочышча Уручча вечным сном спіць не менш як 100 тысяч чалавек.

19 ЯМ-МАГІЛ — ТЫСЯЧЫ АБАРВАНЫХ ЛЁСАЎ

Аб тым, якія страшныя падзеі адбываліся тут больш як восем дзесяцігоддзяў таму, членам Савета Рэспублікі, супрацоўнікам сакратарыята і членам Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе падчас наведвання раней невядомых месцаў масавага пахавання мірных грамадзян і ваеннапалонных расказалі генеральны пракурор Андрэй Швед і кіраўнік следчай групы Генеральнай пракуратуры Валерый Талкачоў.

Згодна з архіўнымі данымі, з 1941 да 1944 года гітлераўцы прывозілі мірных жыхароў, ваеннапалонных з Мінска, бліжэйшых населеных пунктаў і нават з Расіі ў лясны масіў, дзе распраўляліся з імі хутка і бязлітасна — выстралам у галаву. Затым мёртвыя целы ўкладвалі ў некалькі слаёў і засыпалі зямлёй.

(Заканчэнне на 9-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Ушанаванне ветэранаў, адукацыя моладзі, закладка алеі

Першы майскі тыдзень сенатараў быў насычаны падзеямі

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала Смаляк павіншавала з надыходзячым Днём Перамогі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія пражываюць у Брагінскім і Хойніцкім раёнах.

У Брагіне самыя сардэчныя пажаданні ад сенатара прымаў Васіль Нікалаенка, у Хойніках — Іван Шкурко, Васіль Гардзеенка. Парламентарый таксама пацікавілася, ці патрэбна дапамога ветэранам, і, вядома, ад усёй душы падзякавала вызваліцелям за іх подзвіг.

* * *

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Сівец і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы прынялі ўдзел у адкрыцці кабінета рэнтгенакамп'ютарнай дыягностыкі ў Петрыкаўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

* * *

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар прыватнага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Вітбудтэхмаш» Андрэй Сідараў сумесна з аддзелам па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама сустрэўся з навучэнцамі і працоўнымі калектывамі сярэдніх школ № 1 і № 2 г. п. Бешанковічы. Галоўная тэма сустрэчы — пытанні адукацыі моладзі.

«Дзеці — наша будучыня, і гэта будучыня ў нашых руках. Задача настаўніка — выявіць талент дзіцяці і дапамагчы яго развіць. Самае важнае — прысвяціць сябе выхаванню вучняў на аснове патрыятызму, любові да Радзімы і поўнай самааддачы, прытрымліваючыся ідэалаў дабра, гонару і прыстойнасці. Уклад у адукацыю дзяцей — найлепшыя інвестыцыі ў будучыню, — адзначыў сенатар. — «Вітбудтэхмаш» з'яўляецца арганізатарам гарадской алімпіяды па фізіцы «Элемент інжынерыі». Я з радасцю прапаную вам падтрымку. Нашы канструктары ўсталююць у вашых школах неабходныя праграмы для будучых інжынераў, правядуць для іх урокі».

Дасягнута дамоўленасць аб заключэнні з аддзелам па адукацыі райвыканкама пагаднення аб супрацоўніцтве ў мэтах правядзення прафесійна-арыентаваных мерапрыемстваў для навучэнцаў і іх бацькоў.

* * *

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, член Вышэйшага палітычнага савета Беларускай партыі «Белая Русь», старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Брылевіч сумесна са старшынёй Брэсцкага гарвыканкама С. Лабадзінскім, старшынёй Брэсцкага гарсавета А. Філановічам, кіраўніцтвам і актывам Брэсцкага абласнога аддзялення Беларускай партыі «Белая Русь», дэпутатамі і моладдзю прынялі ўдзел у закладцы «Алеі Адзінства». Мерапрыемства прайшло ў гарадскім садзе Брэста.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

«ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ ГЭТА ПРАБЛЕМНАЕ ПЫТАННЕ БЫЛО КАНЧАТКОВА ВЫРАШАНА»

Падрабязнасці прыёму, які Наталля КАЧАНАВА праводзіла ў Жлобіне

У абласцях краіны асабліва прадуктыўна зарэкамендавалі сябе адзіныя дні асабістых прыёмаў грамадзян членамі Савета Рэспублікі. На мінулым тыдні ва ўсіх адміністрацыйных цэнтрах Гомельскай вобласці парламентарыі зноў адпрацавалі ў такім фармаце. Прымалі не толькі жыхароў паўднёва-ўсходняга рэгіёна, але і тых, хто прыехаў са сваімі набалелымі пытаннямі з розных куткоў краіны. У Жлобінскім райвыканкаме звароты людзей выслухала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

Фота БелТА.

Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКА.

ДАРОЖНАЯ «НАВІГАЦЫЯ»

Шукаць дапамогі ў сваім надзённым клопаце ў спікера верхняй палаты парламента вырашыў жыхар Жлобінскага раёна. Сяргей Міхайлавіч жыве на выселках каля вёскі Новыя Маркавічы. Пенсіянер распавёў, як адсутнасць нармальнай дарогі становіцца для яго сапраўдным выпрабаваннем.

— Адзін, лічы, застаўся жыць на выселках нашых, гэта паўтара кіламетра ад вёскі. Вельмі патрэбна дарога. Звяртаўся ўжо да мясцовых улад. Калі дужэйшы быў, можна было хадзіць пешкі ў вёску па прадукты. Цяпер па стане здароўя не магу дабірацца пехатой, дарога зусім разбітая, вясной-восенню гразь такая, што не прайсці, — патлумачыў вясковец.

Увогуле Сяргей Міхайлавіч не першы раз звяртаецца па дапамогу ў Савет Рэспублікі.

— Вельмі добра адносяцца. Наталля Качанава — малайчына, чалавек, які спачувае нам, старым. Раней, калі звяртаўся, на працягу 10-15 дзён мне заўжды адказвалі.

Між тым зноў жа аб праблемнай дарозе па вуліцы Пушкіна ў вёсцы Скепня Жлобінскага раёна падчас прыёму распавяла жыхарка Жлобіна Людміла Міхайлаўна. Вуліцу бясконца падтаплівае, наракае жанчына.

— Службы газу, вывазу смецця, аўтакрама не хочуць прыязджаць да нас, — паведаміла заяўніца.

Хвалюе дарожная праблема не толькі жанчыну, але і ўсіх яе суседзяў.

— Зварот ад усіх людзей, хто жыве на вуліцы, а гэта ў асноўным пенсіянеры, якім складана прайсці па падтопленай дарозе. Нам ні асфальту, нічога дарагога не трэба, толькі каб зрабілі гэту дарогу праезнай, — перадала хваляванне вяскоўцаў Людміла Міхайлаўна.

Як запэўнілі ў райвыканкаме, фактаў нявыезду аварыйных службаў па агучаным адрасе не выяўлена. Але на праблемную дарогу, сапраўды, даўно наракаюць вяскоўцы гэтага населенага пункта.

— Асаблівая ўвага — жыхарам вёскі, — заклікала раённыя ўлады Наталля Качанава. — Нам вельмі важна, каб людзі заставаліся жыць у сельскай мясцовасці. Дзе ні праходзяць прыёмы, больш за ўсё пытанняў па вёсцы, а гэтыя людзі — залаты наш фонд.

Як паабяцаў старшыня Жлобінскага райвыканкама Сяргей Ярац, да 9 мая давядзенне да ладу сельскай дарогі будзе забяспечана. Агучаныя звароты па дарожных праблемах узятыя на кантроль Саветам Рэспублікі.

ВАДА — ВЯДЗЕ...

Традыцыйна паступілі як звароты, якія можна вырашыць вельмі хутка і аператыўна, так і тыя, што патрабуюць дэталёвага разгляду. Яны ўзятыя Старшынёй Савета Рэспублікі на кантроль.

Жыхарка Жлобіна прыйшла шукаць дапамогі ў пытанні спадчыны. Муж заяўніцы і яго сястра не могуць вызначыць, як уступаць у спадчыну. Бо па рашэнні суда адмена спадчынных дакументаў прызнана не правамоцнай. Памерлая свякроў заяўніцы пры жыцці спачатку ў 2019 годзе напісала завяшчанне, па якім трохпакаёвая кватэра пераходзіць у спадчыну дачцэ, а сыну (мужу заяўніцы) — грошы. Пасля яна гэта завяшчанне адмяніла, але ў 2020 годзе жанчыну прызналі недзеяздольнай...

Гэтае пытанне ўзята на кантроль.

Яшчэ адзін агучаны зварот, які таксама ўзяла на кантроль Старшыня Савета Рэспублікі, — падтапленне дома. На працягу многіх гадоў змагаецца з гэтай праблемай, якую стварае блізкае возера, жыхарка Жлобіна, шматдзетная мама Святлана.

— Вада круглы год і ў агародзе, і пад домам, фундамент размывае. Тая ж сітуацыя і на вуліцы. Спадзяюся, што цяпер яна зменіцца. Будуць проста шчаслівыя ўсе жыхары нашай вуліцы, бо пакутуюць ад такой жа праблемы, — патлумачыла Святлана.

Як удакладніла жанчына, пасля яе звароту ў райвыканкам раней на вуліцу для агляду выязджалі камісіі. Абяцалі зрабіць праектна-каштарысную дакументацыю для работ па водапаніжэнні, але доўгі час ужо няма ніякага рашэння.

— Трэба зрабіць так, каб гэта праблемнае пытанне было канчаткова вырашана для ўсёй вуліцы. Пытанне водаадвядзення павінна быць прапрацавана са спецыялістамі. Мы возьмем пытанне на кантроль, — падкрэсліла Наталля Качанава.

З пытаннем рамонту дарогі па адной з вуліц прыватнага сектара Жлобіна звярнулася Раіса Мітрафанаўна.

— Прыйшла не скардзіцца, а ўнесці прапановы па добраўпарадкаванні нашага горада. У цэнтральнай частцы Жлобіна ўсё амаль ідэальна, але хацелася б прыгажосці і ў прыватным сектары, — звярнулася пенсіянерка.

Наталля Качанава парэкамендавала мясцовым уладам прапрацаваць праграму па добраўпарадкаванні на ўзроўні горада.

— Паўсюль жывуць людзі, яны маюць права на камфортныя ўмовы. Сітуацыя з бюджэтнымі сродкамі зразумелая. Магчыма, варта падключаць не толькі бюджэт, але і ЖКГ, і сродкі людзей. Сфарміраваць праграму на пяцігодку і рэалізоўваць яе. Людзі будуць бачыць вынік, будуць удзячныя, — заклікала Старшыня Савета Рэспублікі.

ЯК ЖЫЦЬ?

Маладая жанчына, маці пяцярых дзяцей Людміла, пераканана, што зварот у Савет Рэспублікі — для яе адзіная магчымасць вырашыць раз і назаўжды пытанне з няякасным жыллём ад забудоўшчыка. Маладая маці адчаялася вывесці цвіль у сваёй кутняй кватэры. Жыллё на першым паверсе шматпавярховіка яе сям'я атрымала чатыры гады таму. Як толькі выявілася праблема ў ванным і спальным пакоях, жанчына звярнулася да забудоўшчыка. Не без праблем заяўніца дабілася камісійных аглядаў кватэры, праводзіўся агляд швоў панэльных пліт фасада. Але пытанне да гэтага часу не вырашана. Гэты зварот таксама ўзяты на кантроль Саветам Рэспублікі.

КАНСТРУКТЫЎНЫЯ ПРАПАНОВЫ

На прыём да Наталлі Качанавай з важнай прапановай прыехалі жыхары Гомеля.

— Гэтыя ідэі датычацца захавання гістарычнай памяці. Гэта сведчыць аб тым, што людзі сёння памятаюць і шануюць сваю гісторыю і хочуць, каб яна захоўвалася і перадавалася з пакалення ў пакаленне. І напярэдадні такіх вялікіх свят, як Дзень Перамогі і 80-годдзе вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гэта вельмі важна. Людзей не пакідае раўнадушнай тая работа, якая праводзіцца сёння ўсімі дзяржаўнымі органамі, Генеральнай пракуратурай па выяўленні фактаў генацыду беларускага народа, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Як зазначыла спікер верхняй палаты, сёння можна казаць і аб тым, што тэматыка звароту на прыёмах пашыраецца.

— Ёсць пытанні, якія датычацца дзейных нарматыўна-прававых актаў. У прыватнасці, мы разгледзім і паспрабуем спрасціць працэдуру рэалізацыі лішкаў прадукцыі, якую вырошчваюць людзі на сваіх прысядзібных участках, — распавяла Наталля Качанава. — Між тым некаторыя пытанні ўдаецца вырашыць практычна імгненна на месцы. Думаю, што варта больш правадзіць тлумачальную работу і нам, і дэпутацкаму корпусу, і наогул больш гаварыць аб рабоце са зваротамі грамадзян на мясцовым узроўні. І, напэўна, пытанні на гэтым узроўні будуць вырашацца роўна гэтак жа, як калі б людзі звярталіся да нас.

Ацэньваючы тэматыку часткі звароту людзей, Старшыня Савета Рэспублікі не абмінула ўвагай, што адной з самых хвалюючых праблем, з якімі прыходзяць на прыём, застаецца стан дарог, і дарог менавіта на вёсцы. Таму і пастаўленая задача Прэзідэнтам — асаблівую ўвагу ўдзяліць стану мясцовых дарог, звярнула ўвагу яна.

Рэзюміруючы практыку работы са зваротамі грамадзян, Наталля Качанава адзначыла, што члены Савета Рэспублікі ў гэтай дзейнасці імкнуцца да максімальнай рэзультатыўнасці, адкрытай і разумелай для людзей работы.

— Прыёмы грамадзян — цяжкая праца, аднак заўсёды атрымліваеш станоўчыя эмоцыі, калі можаш дапамагчы людзям вырашыць іх пытанні і праблемы, — адзначыла Наталля Качанава.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

АБАВЯЗАК БЕЛАРУСАЎ — НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПАДОБНАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

У выніку расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа толькі на тэрыторыі гэтага ляснога масіву з 2021 года выяўлена 19 ям-магіл. Гэта стала магчыма дзякуючы тагачасным картам, нямецкай аэрафотаздымцы. Месцазнаходжанне 11 ям-магіл, аб якіх увогуле няма ніякай згадкі ў архіўных дакументах, з высокай дакладнасцю ўдалося вызначыць дзякуючы прымяненню новага праграмнага комплексу беларускіх вучоных.

З пяці ям-магіл, выяўленых летась, былі падняты астанкі не менш як 742 чалавек, уключаючы дзяцей, жанчын і старых. Работа па астатніх ямах восенню 2023 года была прыпынена. З надыходам спрыяльных умоў надвор'я сёлета, у сакавіку, палявыя пошукавыя работы аднавіліся — спецыялісты раскрылі чатыры раней выяўленыя ямы з астанкамі касцей. У адной з іх быў знойдзены салдацкі медальён. Пасля правядзення экспертызы было ўстаноўлена, што ён належаў радавому Капелю Майшэвічу Файнбергу 1910 года нараджэння, ураджэнцу г. Лахва Лунінецкага раёна Пінскай вобласці. Усе члены сям'і чырвонаармейца, за выключэннем брата, які застаўся ў жывых, загінулі ў Беларусі ў гады вайны. У цяперашні момант ажыццяўляюцца пошукі сваякоў загінулага.

Кажучы аб дэталях расследавання, **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД** звярнуў увагу на той факт, што ў гэтым журботным месцы мірнае насельніцтва і ваеннапалонных бязлітасна знішчалі не толькі нямецкія карныя падраздзяленні, але і сумна вядомы 2-і літоўскі паліцэйскі батальён. «Без кроплі сумнення яны расстрэльвалі і закопвалі жыўцом дзяцей, жанчын і старых, — канкрэтызаваў генпракурор. — Падчас раскопак мы знайшлі астанкі вялікай колькасці менавіта дзяцей, а таксама маладых жанчын ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў. У адносінах да нашага насельніцтва нацысты і іх памагатыя прадэманстравалі беспрэцэдэнтны ўзровень бесчалавечнасці».

Па словах Андрэя Шведа, работа на месцы масавага знішчэння людзей супрацоўнікамі Генеральнай пракуратуры завяршаецца толькі тады, калі сабрана ўся інфармацыя і зроблена ўсё неабходнае, каб да гэтых месцаў вадзілі школьнікаў. Супрацоўнікі ведамства працягнуць практыку паказваць месцы масавага знішчэння людзей моладзі, якая павінна мець рэальнае ўяўленне аб падзеях, што адбываліся на беларускай зямлі 80 і больш гадоў таму.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА заўважыла, што Генеральная пракуратура робіць вялікую справу. «Нізкі вам паклон, — падкрэсліла спікер. — Перш за ўсё гэта наша памяць. Устанавіць хоць адну сям'ю, аднаго чалавека, якога столькі гадоў спрабуюць знайсці, дзе ён пахаваны — наш абавязак». Спікер акцэнтавала ўвагу на мастабах трагедыі. «Як можна гэта забыць? Гэта немагчыма! — падкрэсліла яна. — Трэба ўсяму свету паказаць тое, што адбывалася тут. Мы павінны зрабіць усё, каб не дапусціць падобнага».

«СВЕТ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ, ШТО АДБЫВАЛАСЯ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ»

У размове з журналістамі спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што няма апраўдання нацызму, тым людзям, якіх і людзьмі назваць нельга, што здзяйснялі такія зверствы. «Яны (акупанты. — **«Зв.»**) знішчалі наш народ, вынішчалі яго, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Таму мы ў даўгу перад тымі, хто адстаяў свабоду і незалежнасць, цаной свайго жыцця даў нам мірнае неба. Мы ўдзячны тым, хто ваяваў, змагаўся. Але самае страшнае, калі гінулі ні ў чым невінаватыя дзеці, жанчыны, якіх тут шмат пахавана».

Старшыня Савета Рэспублікі выказала словы ўдзячнасці і падзякі Генеральнай пракуратуры, якая выступіла з ініцыятывай правядзення такой работы, Прэзідэнту — за тое, што падтрымаў гэтую прапанову, наставіў на шлях, каб была раскрыта ўся праўда аб той трагедыі, якая адбылася на нашай зямлі. Наталля Качанава ўпэўнена, што ў кожнага, хто ўбачыў месцы масавага знішчэння, сэрца на разрыў. «Немагчыма сабе ўявіць тое, што адбывалася на нашай шматпакутнай зямлі», — заўважыла спікер і нагадала, што члены Савета Рэспублікі ў свой час падтрымалі ініцыятыву Генеральнай пракуратуры і выступілі ў падтрымку распрацоўкі Закона «Аб генацыдзе беларускага народа». На яе думку, гэтае заканадаўчае рашэнне было абсалютна правільным.

«Свет павінен ведаць, што адбывалася на нашай зямлі, і разумець, што беларусы будуць рабіць усё, каб захаваць мір і спакой і ніколі надалей не дапусціць такой трагедыі, якая разгарнулася на нашай зямлі не па нашай волі, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Людзі гінулі і пакутавалі за той кавалак зямлі, на якім яны хацелі жыць і гадаваць сваіх дзяцей».

ТОЕ, ШТО АБ'ЯДНОЎВАЕ НАЦЫЮ

Пасля цырымоніі ўскладання кветак у мемарыяльным комплексе «Масюкоўшчына» Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што чым далей мы жывём ад усіх страшных падзей, тым больш разумеем, што сапраўды гэта патрэбна нам, жывым, для таго, каб падобнае не адбылося зноў. «Наш народ проста знішчалі, яго знішчалі, каб яго не было ў гэтым свеце, — звярнула ўвагу спікер. — І калі ты размаўляеш з моладдзю, можа быць, дзесьці ўжо чуеш, што шмат гаворым пра вайну, але гэта тое, што сёння аб'ядноўвае нас — як народ, як нацыю. Тая памяць — гэта наша сумленне. Сумленне перад тымі, хто склаў сваю галаву. Памяць перад тымі, хто сёння жыве. І нам пашчасціла жыць побач з тымі людзьмі, якія прайшлі горан гэтай страшнай трагедыі. Памяць перад тымі, хто аднаўляў у пасляваеннае ліхалецце нашы гарады і вёскі. Памяць аб тых, хто стварыў такую цудоўную незалежную суверэнную Беларусь у мірны час. І таму, вядома, няхай чуюць усе ў свеце, няхай ведаюць — беларускі народ ніколі не дапусціць нацызму і фашызму на сваёй зямлі, і мы будзем рабіць усё для таго, каб гэта не дапусціць надалей».

Мемарыяльны комплекс «Масюкоўшчына» — помнік ваеннапалонным і мірным грамадзянам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў адным з найбуйнейшых на акупаванай тэрыторыі былога Савецкага Саюза канцэнтрацыйным лагеры смерці. Да тых, хто ў ім утрымліваўся, фашысты прымянялі асабліва жорсткую сістэму катаванняў і зневажанняў чалавечай годнасці. З ліпеня 1941-га да 3 ліпеня 1944 года ў «Штала-зе-352» загінула больш як 80 тысяч салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, якія трапілі ў палон, мірных жыхароў, сагнаных у лагер з Мінска і навакольных вёсак. Вечная ім памяць!

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ІНТЭНСІЎ ДЛЯ ФАНАТАЎ РАЗВІЦЦЯ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

ВУЧЫЦЦА разам папулярызаваць практыку грамадзянскіх ініцыятыў прапаноўваюць дэпутаты Гомельшчыны. Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў арганізавала практычнае навучанне па асновах праектнага менеджменту для актывістаў з розных раёнаў вобласці.

Тэорыя ў дапамогу

Выязны семінар правялі на тэрыторыі Гомеля і Веткаўскага раёна. Яго ўдзельнікамі сталі супрацоўнікі сельвыканкамаў, устаноў культуры, адукацыі, сацыяльнай службы, прадстаўнікі органаў і камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Пачалася насычаная праграма з навучальнага трэнінгу. Запрошаныя спікеры прапанавалі разгледзець пытанне ўдзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні ў межах прававога поля, разабрацца ў асаблівасцях арганізацыі інфармацыйна-ідэалагічнай работы з актывістамі. Цікавым досведам стала навучанне эфектыўнай камунікацыі з насельніцтвам з выкарыстаннем псіхалагічных прыёмаў. Удзельнікі аналізавалі таксама ўжо рэалізаваныя праекты і ініцыятывы.

— У мінулым годзе мы ўдзельнічалі ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў, але, на жаль, не сталі пераможцамі. Ды не здаліся. Разам з людзьмі, дэпутатамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў рэалізавалі сваю ідэю — на тэрыторыі аграгарадка Стаўбун усталявалі дзіцячую пляцоўку. Дзеці і бацькі вельмі задаволены, — распавяла ўдзельніца семінара старшыня **Стаўбунскага сельскага Савета Веткаўскага раёна Вераніка НІКАЛАЕВА.** — Мы збіраемся працягваць удзельнічаць у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі з новымі сваімі праектамі. Трэнінг дапаможа атрымаць неабходны досвед, павучыцца ў калег, каб наступны раз дакладна перамагчы.

Як нагадала **старшыня праўлення Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА,** унесеныя ў мінулым годзе змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» акрэслілі механізм ажыццяўлення праектаў грамадзянскіх ініцыятыў.

— Яны могуць уключаць як добраўпарадкаванне зямель агульнага карыстання населеных пунктаў, так і будаўніцтва або рэканструкцыю сацыяльна значных аб'ектаў, што вырашаюць пытанні мясцовага значэння, — патлумачыла Вікторыя Ладуцька. — Праведзены раней Гомельскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў конкурс грамадзянскіх ініцыятыў паказаў, што жыхары рэгіёна маюць цікавыя ідэі развіцця сваіх населеных пунктаў. Але не ўсім людзям пакуль хапае тэарэтычных ведаў у праектнай сферы. Таму мы вырашылі арганізаваць серыі семінараў-трэнінгаў па навучанні жыхароў, прадстаўнікоў мясцовых тэрытарыяльных органаў самакіравання правілам падрыхтоўкі праектаў, каб яны маглі больш актыўна ўдзельнічаць у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Ініцыятывы духоўнай спадчыны

Падчас практычнай часткі трэнінгу, якая прайшла на тэрыторыі Веткаўскага раёна, госці з іншых мясцін на свае вочы пабачылі, як увасобілі ў жыццё ідэі добраўпарадкавання і развіцця тэрыторый актывісты аграгарадкоў Шарсцін, Навасёлкі, Радуга.

Так, у Шарсціне жыхары не толькі ўласна аграгарадка, але і многія неабыякавыя людзі з розных населеных пунктаў Веткаўшчыны аб'ядналіся, каб добраўпарадкаваць тэрыторыю вакол мясцовай асвечанай крыніцы. Тут правялі маштабную рэканструкцыю, пабудавалі каля крыніцы капліцу.

Гэтае святое месца ў Шарсціне для праваслаўных вернікаў звязана са святым праведным Іаанам Кармянскім — пры жыцці Іаанам Іаанавічам Гашкевічам. Менавіта ў перыяд, калі служыў у Шарсціне Іаан Кармянскі, побач з крыніцай мясцовым жахарам на дрэве адкрыўся вобраз святой велікамучаніцы Параскевы-Пятніцы.

— З урачыстымі спевамі яго перанеслі ў храм. Але раніцай вобраз зноў апынуўся на тым жа самым месцы, каля крыніцы. І зноў яго перанеслі ў храм. Але Гасподзь трэці раз па сваім нябачным загадзе вярнуў вобраз велікамучаніцы на ранейшае месца. Тады над крыніцай узвялі капліцу, а дзівосны вобраз Параскевы-Пятніцы паставілі ў ёй, — распавёў гісторыю, якую з пакалення ў пакаленне перадаюць мясцовыя жыхары, **настаяцель храма Святіцеля Мікалая Цудатворца аграгарадка Данілавічы Веткаўскага раёна протаіерэй Андрэй БУЛАЦКІ**.

Вобраз святой велікамучаніцы Параскевы-Пятніцы захоўваўся ў капліцы да моманту яе разбурэння ў 1935—1936 гадах. Далейшы лёс цудатворна адкрытай іконы застаўся невядомым.

— Але ў Шарсціне знаходзіцца яшчэ адна дзівосная двухбаковая ікона. Яна таксама старажытная. Відаць, гэта храмавы абраз. На адным баку выява святой велікамучаніцы Параскевы-Пятніцы, а на адваротным — выява Нараджэння Багародзіцы, у гонар якой і быў пабудаваны былы храм у Шарсціне. У 2014 годзе вобраз быў адрэстаўрыраваны, захоўваецца ён у Шарсціне ў доме Валянціны Фелькінай, — патлумачыў протаіерэй Андрэй Булацкі. Менавіта ён аказаў самую шчырую падтрымку неабыякавым вяскоўцам, якія захацелі добраўпарадкаваць месца асвячонай крыніцы. Арганізавала вяскоўцаў на добрую справу тая самая жыхарка Шарсціна Валянціна Фелькіна. Значную дапамогу ў гэтай ініцыятыве аказаў Веткаўскі раённы Савет дэпутатаў і Прысянянскі сельвыканкам, на тэрыторыі якога размешчаны аграгарадок Шарсцін.

Землякі бяруцца за справу

